Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

СЬНЕЖАНЬ 1 1932 г. № 268 (4520)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — У барацьбе за мір. Інж. РОЗІН — Рэдкія мэталі ў БССР і іх вывучэньне (2 стар.). СУЧКОВА — У Жлобіне акапаліся вялікадзяржаўнікі (3 стар.)

У Дрысе парушаюць закон ураду аб забароне гандлю збожжам да выкананьня рэспубліканскага пляну (1 стар.).

Аграном сядзіць у кайдалярні (3 стар.).

Выраб тавараў шырпакыву на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце па-за ўвагай заводзкіх арганізацый (3 стар.).

ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ (3 стар.).

Працэс Тарашкевіча (4 стар.).

Пратэст радыкальнага беларускага і украінскага студэнцтва і чэскіх культурных працаўнікоў (4 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Падпісаньне францка-савецкага дагавору аб ненападзе (1 стар.).

1855 год катаргі для рабочых (1 стар.).

Яўрэйскія пагромы ў Львове (1 стар.).

У барацьбе за мір

Сьледам за ратыфікацыяй пакту аб ненападзе паміж СССР і Польшчай адбылося падпісаньне ў Парыжы такога-ж пакту і зьвязанай з ім згаджальнай канвэнцыі паміж СССР і Францыяй. Такім чынам намаганьні Савецкага саюзу ў барацьбе за мір увянчаліся новым посьпехам, прынесьлі нам новую буйную перамогу.

Працоўныя масы Беларускай ССР з асаблівым задаваленьнем сустрэлі ратыфікацыю пакту аб ненападзе з Польшчай, якая непасрэдна мяжуецца з нашай рэспублікай. Добра вядома, што ў інтэрвэнцыянісцкіх планах імпэрыялістаў Польшчы адводзілася асобная роля, роля авангарду, які ўрывацца першай штурмовай калёнай у межы савецкай краіны. На нашай тэрыторыі разгарэліся-б першыя зьнішчальныя бае. Працоўному насельніцтву Беларускай ССР прыйшлося-б зноў перажыць, магчыма яшчэ ў большых размерах, жудасьці былой імпэрыялістычнай вайны і інтэрвэнцыі ў першыя гады рэвалюцыі. Мы былі-б зноў адкінуты ад стваральнай работы па адбудове сацыялістычнага грамадзтва, каб са зброяй у руках поплеч з брацкімі народамі ўсяго Савецкага саюзу, абараняць нашу свабоду, нашу незалежнасьць, наша права будаваць новае жыцьцё.

Зусім бясспрэчна, што і працоўныя масы Польшчы будуць горача ўітаць умацаваньне мірных адносін з СССР.

Мы разглядаем савецка-польскі акт, як новую ступень у барацьбе за мір, як поўную гарантыю мірных адносін паміж СССР і яго найбольш буйным суседам на Захадзе. Гэтак-жа сама мы разьцэньваем і савецка-французкі пакт. Калі ўлічыць, што Францыя амазвала ўвесь час вялікі ўплыў на замежную палітыку Польшчы і іншых нашых заходніх суседзяў, то абодва гэтыя пакты трэба лічыць буйным дыпляматычнай перамогай Савецкага саюзу.

Заключэньне савецка-польскага пакту вызначаецца нікумленным краўленьнем таго, што ў кіруючых колах польскай буржуазіі, нарэшце, усьвядомлена неабходнасьць і двухбокая выгоднасьць устанаўленьня добрасуседзкіх адносін з СССР. Нам няма чаго паспамінаць і прыводзіць доказы таго, як модны былі да гэтага часу агрэсыўныя антысавецкія ўплывы сярод польскай буржуазіі, іншыя як ад англійскіх імпэрыялістычным і шаўвіністычным чадам колаў, якія пасьлеся з блакітнай ідэяй «вялікай Польшчы ад мора да мора», так і з боку гаменных імпэрыялістычных сіл, разглядаўшых Польшчу, як «бар'ер, абараняючы эўрапейскую цывілізацыю ад бальшэвізму», а краіну шлей, як зброю сваёй антысавецкай палітыкі.

Давялі сказаць, што заключэньне пакту аб ненападзе пасьлядавала толькі праз шэсьць год пасьля прадпоўнай аб гэтым з боку СССР. І тады, калі рад такіх пактаў ужо быў нават заключан з цэлым родам дзяржаў, у тым ліку і з нашымі агульнымі суседзямі — Літвой, Латвіяй і Фінляндыяй, —Польшча пад рознымі прадлогамі пярэчыла заключэньню з СССР дагавору аб гарантыі мірных адносін.

Пазіцыя былі абвіцца сур'ёзным перагрупоўкі ўнутры краіны і на міжнародным арэне, перагрупоўкі, зьвязаныя з жорсткім эканомічным крызісам і крызісам усёй міжнародна-палітычнай сыстэмы, створанай Вэрсальскім дагаворам, каб у Польшчы, нарэшце, зразумелі, што заключэньне пакту ў яе-ж уласных інтарэсах.

Заключэньне савецка-польскага і савецка-францускага пактаў аб ненападзе зьяўляецца плодам шматгадовага адпораўнальнем на міжнародным арэне суадносін сіл, якія зьмяніліся ў нашу карысьць, адлюстраваньнем росту сымпатый працоўных мас усяго сьвету да нашай краіны, адлюстраваньнем узрослай ролі Савецкага саюзу ў міжнароднай палітыцы.

Эканомічны крызіс у капіталістычных краінах, які ўсё паглыбляецца і абвастраецца, нясучы нячуваныя бядоты шматмільённым масам рабочай клясы і сялянства, у вялізарнай меры павялічыў іх зацікаўленасьць і сымпатыі да адзінай краіны, дзе няма беспрацоўя, дзе замест крызісу здбываецца выключны і наўхільны ўздым прадукцыйных сіл, дзе закладзены ўжо моцныя асновы сацыялістычнага грамадзтва. У такіх умовах думаць аб тым, каб гэтыя масы, якія ўсё больш бачаць адзіны выхад з крызісу, з перажываемых бядот у рэвалюцыі, узьняць на вайну супроць СССР, было-б шалецтвам.

Пад уплывам крызісу ў значнай меры вырасла і зацікаўленасьць асобных капіталістычных груповак у пашырэньні і ўмацаваньні гандлёвых, эканомічных адносін з СССР.

Мы далёкі ад ілюзій. Мы не заплюшчваем вачэй на рэальную сапраўднасьць. Мы не верым у цудадзейную сілу дыпляматычных дакумантаў, якімі-б яны ни былі добрымі самі па сабе. Заключэньне пактаў яшчэ ня зьнічае пагрозы вайны і інтэрвэнцыі. Цёмныя сілы сусьветнага імпэрыялізму яшчэ працуюць на вайну, правакуючы СССР. Сусьветная буржуазія шукае і будзе шукаць выхаду з крызісу ў новай вайне і інтэрвэнцыі, як пралетарыят шукае і ня можа ня шукаць гэтага выхаду ў рэвалюцыі. І ва Францыі і ў Польшчы таксама дзейнічаюць асобныя капіталістычныя групоўкі, варожыя СССР, якія імкнуцца сарваць нашы мірныя адносіны. Сур'ёзнейшай гарантыяй усягульнага міру зьявілася-б усягульнае і поўнае разбраеньне, за якое Савецкі саюз змагаецца з неаслабнай упартасьцю. Але хто цяпер ня бачыць краху «разбраенчай» канфэрэнцыі ў Жэнэве?

Не разглядаючы дыпляматычныя згоды, як поўную і бязумоўную гарантыю ад магчымага нападу на нашу краіну, мы бачым у заключаных пактах прыступленьне антысавецкага лёза імпэрыялістаў, сур'ёзную ступень у барацьбе за мір.

Што дэтычыць нас саміх, то мы далі даволі доказаў вернасьці прынятым на сябе абавязацельствам.

Ад гэтага часу на нашай заходняй мяжы засталася адзіная дзяржава, якая і дагэтуль захоўвае свае старыя антысавецкія пазыцыі. Гэта Румынія. Але ў новых умовах упартасьць пана Тытулеску прадстаўляе ўжо проста дрэнна разыграваны фарс. Замежная палітыка Румыніі ў новых, зьмененых умовах прадстаўляе палітыку самазаляцыі. Недарма гэта палітыка выклікае ўсё больш рэзкае асуджэньне нават у бліжэйшых да Тытулеску буржуазных колах Румыніі.

Вітаючы заключэньне пактаў аб ненападзе з Польшчай і Францыяй як буйнейшую перамогу нашай мірнай палітыкі, будзем наўхільна праводзіць далей нашу барацьбу за мір, за далейшы рост эканамічнай і палітычнай магутнасьці Савецкага саюзу.

У Дрысе парушаюць закон ураду

АБ ЗАБАРОНЕ ГАНДЛЮ ЗБОЖЖАМ ДА ВЫКАНАНЬНЯ РЭСПУБЛІКАНСКАГА ПЛЯНУ

Калгасы МТС выканалі плян збожжазагатовак

Рапарт Белтрактарацэнтру

Чацьвертаму пленуму ЦК КП(б)Б, СНК БССР, праўленьню Трактарацэнтру і рэдакцыі „Зьвязды"

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, на чале якога стаіць выпрабаваны бальшавік тав. Гікало, на аснове мабілізацыі работнікаў МТС і калгаснікаў вакол пастаўленых КП(б)Б і ўрадам БССР задач па здачы (продажу) збожжа і бульбы дзяржаве,—калгасы БССР, што абслугоўваюцца МТС, на 25 лістапада выканалі плян загатовак збожжа, замест плянавага заданьня ўраду ў 8.000 тон,—8.041 тону, або 100,5 проц.

Па бульбе—замест плянавага заданьня 45.745 тон, здана 48.745 тон, або 105 проц.

Рапартуючы пленуму ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб гэтых дасягненьнях, Трактарацэнтр і МТС пераключаюць усе свае сілы на перавыкананьне пляну збожжазагатовак, поўнае пагашэньне насеннай пазыкі і ўзмацненьне тэмпаў загатовак ільну і канапель.

Запэўнаем пленум ЦК і СКК БССР, што МТС і гэтыя заданьні партыі і ўраду выканаюць з посьпехам.

Няхай жыве ЦК КП(б)Б!

Упаўнаважаны Трактарацэнтру па БССР ТАМАШЭЎСКІ.

Аднаасобны сэктар па-за ўвагай

14 раёнаў БССР перавыканалі пляны збожжазагатовак па калгасным сэктары (без насеннязыкі).

Аднак, гэтыя раёны яшчэ ня выканалі агульных плянаў.

Аддаўшы выключную ўвагу збожжазагатоўкам па калгасах, яны пакінулі на самацёк аднаасобныя гаспадаркі, забыліся аб тым, што трэба АРГАНІЗАВАЦЬ здачу збожжа працоўнымі аднаасобнікамі.

Возьмем ДЗЯРЖЫНСКІ раён. Ён выканаў плян здачы збожжа па калгасах на 116 проц, а па аднаасобным сэктары толькі на 24 проц. КЛІМАВІЦКІ раён дабіўся здачы збожжа калгасамі на 102,8 проц, а аднаасобнікі вельмі адсталі—47 проц.

МСЬЦІСЛАЎСКІ раён, які ў першыя дні кампаніі паказаў узоры загатовак па аднаасобным сэктары, зараз дае такія вынікі: па калгасах—112 проц., па аднаасобным сэктары—36 проц.

ХОЙНІЦКІ раён ідзе ў першай калёне па здачы збожжа калгасамі—132 проц., аднак, ён упусьціў з-пад увагі аднаасобнікаў, якія здалі 26,2 проц. У Брагінскім раёне калгасы здалі 98 проц., аднаасобнікі—35 проц. У Бярэзіне адпаведна—101 проц. і 73,8 проц.

Трэба адзначыць, што «лявацкая» недаацэнка аднаасобнага сэктару па гэтых раёнах цесна злучаецца з фактамі яўнага патураньня кулацтву. Дзяржынскі раён спагнаў па цьвёрдых заданьнях 26,1 проц., Клімавіцкі—56 проц., Мсьціслаўскі—35,9 проц., Брагінскі—13,5 проц., Бярэзінскі—12,1 проц., Хойніцкі зусім не дае ніякіх вестак аб выкананьні цьвёрдых заданьняў.

Гэтыя лічбы сыгналізуюць аб неабходнасьці мабілізаваць увагу ўсіх арганізацый на ліквідацыю адставаньня аднаасобнага сэктару, на ўзмацненьне напіску на кулацка-заможныя гаспадаркі.

Плян перавыканан

ЖЫТКАВІЧЫ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). НА 28 ЛІСТАПАДА ГАДАВЫ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ВЫКАНАН ЖЫТКАВІЦКІМ РАЁНАМ НА 107,4 ПРОЦ., НА НАСЕННЯЗЫЦЫ—НА 100,4 ПРОЦ.. УВЕСЬ ПЛЯН ПА ЗБОЖЖЫ ВЫКАНАН НА 102,3 ПРОЦ.

РК БУЦЬКО.

Райзагатзбожжа КІСЯЛЮК.

Ворагі сацыялістычнай маемасьці

ДРЫСА. У свой час адзначалася, што ў Дрысе разьвілася спэкуляцыя збожжам, што ў раёне не вядзецца ніякай барацьбы з разбазараньнем збожжа.

Раённыя арганізацыі Дрысеншчыны павінны былі прыняць неадкладныя меры для выпраўленьня дапушчаных памылак, для бальшавіцкага правядзеньня збожжазагатовак.

Гэтага ня зроблена.

Плян збожжазагатовак (разам з насеннязыкай) выканан на 25 лістапада на 50,3 проц. Адзнай з прычын нездавальняючага ходу загатовак зьяўляецца зусім невыстарчальная барацьба з разбазараньнем збожжа, з кулацка-рэацкімі і месьніцкімі тэндэнцыямі ў паасобных калгасах.

Перад намі дагавор, падпісаны старшынёй калгасу «Пралетары», Каркалецкага сельсавету, **Васілеўскім** і праўленьнем полапкай прамысловай арцелі «Белкустарь» **Зарубовічам.** Дагавор заключан на узаемны абмен прадукцыяй: калгас дае сельгаспрадукты, арцель—прамтавары. У дагаворы запісана: «**Калгас абавязваецца адгрузіць арцелі 60 пудоў жытняй мукі па 20 руб. за пуд, 40 пудоў пшанічнай мукі па 20 руб. за пуд, 120 пудоў аўса па 10 руб. і г. д.**».

На станцыі Дрыса нягаўна была затрымана на партыя жытняй мукі, аўса і пшаніцы, у колькасьці 160 пудоў, падрыхтаваная для адгрузкі ў Полацак, у выкананьне заключанага дагавору.

Хто даў права праўленьню калгасу «Пралетары» парушаць закон ураду аб забароне гандлю збожжам да выкананьня рэспубліканскага пляну загатовак? Хто дазволіў ім прадаваць збожжа і ня выконваць пляну дзяржаўных загатовак?

Праўленьне калгасу «Пралетары» заняло яўна злачынныя зьдзелкамі. У праўленьне ўлезьлі заможнік, раней абкладзены цьвёрдым заданьнем **Шчарбікскі**, заможнік **Балтрушэвіч**, якія сьпеліся са старшынёю калгасу—апартуністам **Васілеўскім.**

Яшчэ факты. У таварыстве на сумеснай апрацоўцы зямлі («ТОЗ») «Пераможнік» Валынецкага сельсавету, збожжазагатоўкі амаль не пачаліся. «Пераможнік» ня выконвае сваіх абавязкаў перад дзяржавай. У гэты-ж час раскрадаецца абагуленае збожжа. У сьвірне «ТОЗ»'у нядаўна было ссыпана каля 200 пуд. збожжа. Член таварыства Барох зламаў замок і ўкрадзе 15 пуд. Узяўшы каня ў тр. Пятроўскага, ён адвёз гэта жыта ў Валынцы да гандляркі Шэйкман, якая потым перапрадала яго на рынку. Валынецкі сельсавет не заўважае гэтых злачынстваў. Райкалгасаюз, партыйная і камсамольская ячэйкі ніякіх мер не прынялі да выгнаньня з таварыства кулакоў і іх агентаў.

У калгасе «**Чырвоны горэй**», Цостаўскага сельсавету, не ажыцьцяўляецца пастанова ўраду аб ахове сацыялістычнай маемасьці. У часе асенняй сэўбы ўпраздзена тры цэнтнэры насеннага жыта. Нягаўна зноў разкрадзена шмат бульбы і розных збожжавых культур. Старшыня калгасу **Багдан**, былы заможнік, падрывае калгаснае будаўніцтва і даламагае разбазараньню збожжа.

Гэтыя факты гавораць аб засьмечанасьці раду калгасаў кулацкімі элементамі, аб прыступленьні класавай сіляснасьці ў разьмясцовых арганізацый, якія ня прымаюць мер да ачысткі калгасаў ад чужых элементаў, для мабілізацыі калгасных мас на барацьбу за збожжа.

Шаша Менск—Ворша адкрыта

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Урачыстае адкрыцьцё магістралі Менск—Ворша ператварылася ў грандыёзнае сьвята большасьці перамог. Адбыліся масавыя шматлюдныя мітынгі ў СМАЛЯВІЧАХ, ЖОДЗІНЕ, БАРЫСАВЕ і на іншых вучастках дарогі.

Кілёмэтраў за пяць ад Менску, у канцы выстаўкі, дзе пачынаецца новая шаша, сабраўся шматлюдны мітынг пралетараў і працоўных сялянаў.

На мітынгу, які быў адкрыт сакратаром гор кому КП(б)Б т. ШПЭКТАРАВЫМ, з вялікай прамовай выступіў старшыня СНК БССР т. ГАЛАДЗЕД, т. КАРАНЕЎСКІ і начальнік 5-га дарбудваўчастку т. ВІТКОЎСКІ.

У 11 гадзін 30 хвілін, пад гукі трох арыстраў, т. ГАЛАДЗЕД перарэзае чырвоную істужку. Дарога адкрыта, дарога ўступае ў строй. Дзесяткі прадстаўнікоў ураду, ЦК партыі, ударнікаў менскіх заводаў паехалі на савецкіх аўтамабілях па новай дарозе вітаць дарожнікаў з новай перамогай.

У СМАЛЯВІЧАХ і ЖОДЗІНЕ на арганізаваных шматлюдных мітынгах з прамовамі выступілі т. т. ГАЛАДЗЕД і ШАРАНГОВІЧ.

На ўсіх дарожных пунктах, праз якія праходзіць магістраль, адчуваецца сьвята і ўрачыстасьць.

У 3 гадзіны 30 хвілін адбыўся вялізарны мітынг у БАРЫСАВЕ. Пралетарскі Барысаў мае ўрачыста-сьвяточны выгляд. Гарадзкі пляц упрыгожан сотнямі лёзунгаў і плякатаў, якія кажуць аб перамогах. На мітынг згуртаванымі калёнамі прышлі пралетары гуты імя Дзмбаля, «Чырвонай Бярэзіны», «Пралетарскай перамогі», «Камінтэрну», чырвонармейскія часьці, камсамольцы і піянэры.

З вялікімі прамовамі выступілі т. т. ГАЛАДЗЕД і ШАРАНГОВІЧ, а таксама начальнік Галоўдартрансу т. ФРУМКІН.

Барысаўцы ў гонар прыезду сакратароў ЦК КП(б)Б т. т. ШАРАНГОВІЧА і ІВАНОВА, старшыні СНК БССР т. ГАЛАДЗЕДА ўзялі на сябе абавязкі ахоўваць пабудаваную дарогу, змагацца за сотні новых кілёмэтраў новай шашы ў будучым будаўнічым сэзоне. Новая, бліскучая, удасканаленая магістраль яркай істужкай праразае непраходныя беларускія балоты, лясы, узгоркі.

На фронце сацыялістычнага наступленьня атрымана новая буйная перамога. Здан краіне 161 клм. пабудаванай дарогі. Праграма 1932 г. па дарбудаўніцтве з гонарам выканана. Адкрытая магістраль Менск—Ворша мае вялізарнае значэньне ў разьвіцьці сацыялістычнай эканомікі і культуры БССР.

ЛІЧБЫ ПЕРАКОНВАЮЦЬ

(Ад нашай віцебскай брыгады)

— Гандляваць то мы гандлявалі, а вось што выгандлявалі ня ведаем,—чуцен з кутка голас калгаснікa—барадача.

— Пляжкую вы задачу перад намі паставілі,—кажа старшыня калгасу **тав. Паўлоўскі.**—Мы нават яшчэ дакладна непадлічылі сваіх даходаў.

Ня ведаюць аб рэальных выніках калгаснікі, слаба аб іх уяўляе старшыня. Толькі адзін рахункавод штодзенна сочыць за лічбамі, за даходам ад калгаснага гандлю.

Але што з таго, што ён сочыць? Гэтага мала. Трэба кіраўніком калгасу навучыцца выконваць указаньні Ільліча: «**Увесьці спраўдзачнасьць і гласнасьць у працэсе вытворства хлеба, вопратки і інш., ператварыць сухія, мёртвыя, бюракратычныя справаздачы ў жывыя прыклады—як адштурхоўваючыя, так і захапляючыя**».

А садова-гароднаму калгасу **імя Чырвонай армії, Елагінскага сельсавету (Віцебшчына)** ёсьць, што паказаць.

Сёлета калгасам было засеяна 101 га гародніны, 110 га бульбы, закладзена 3.000 парніковых рам. Сельгасарцель (адзнае 164 гаспадаркі) актыўна змагалася за выкананьне пляну насьўнай кампаніі.

Выконваючы колькасныя паказальнікі **кіраўніцтва забыла пра асноўнае, пра якасьць апрацоўкі глебы, пра ўкараненьне агратэхнікі.** У выніку—ураджайнасьць нежаная. 200-250 пуд. бульбы недадаў кожны гэктар. Капусты атрымана з гэктара на 350 пуд. менш сярэдняга ураджайнасьці і г. д.

І ўсё-ж лічбы атрыманага ўраджаю сьведчаць аб значным росьце таварнасьці арцелі. Адзнай гароднины зьнята: гуркоў—184 тоны, морквы—92,5 тоны, сталовых буракоў—52 тоны, капусты—210 тон, бручкі—18 тон, кармовых буракоў—49 тон, бульбы — 720 тон. Жыта атрымана 80 тон з 92 га.

Калгас з гонарам выканаў свае абавязкі перад дзяржавай. Збожжа (9 тон) здана поўнасьцю, бульбы адгружана замест 165 тон,—167, капусты—149—152 тоны, морквы замест 27—31 тона.

Выканаўшы плян загатовак, стварыўшы насенныя кармовыя фонды, калгас прыступіў да разьмеркавальня даходаў выключна па працыднёх. Зьнішчана ўраўнілаўка. Поўнасьцю захован прынцып — хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае.

Аценка кошту працадня наглядна паказвае, як з кожным годам калгас усё больш і больш умацоўваецца.

У 1931 годзе на адзін працадзень прыпадала: бульбы—0,44 клгр., бручкі—2,12 клгр., грашыма—62,7 кап. У гэтым годзе **кожны калгаснік ужо атрымаў на адзін працадзень: збожжа—0,6 клгр., бульбы — 4 клгр., бручкі—3 клгр., капусты—0,5 клгр., яблык—0,2 клгр., сена—2,5 клгр., і авансам па 2 рублі.** Кожны калгаснік у бліжэйшыя дні пасьля сканчэньня малацьбы яшчэ атрымае па 0,4 клгр. збожжа на адзін працадзень.

Ударнік брыгады № 5 **Уданоўскі Іван** разам з жонкай выпрацаваў з 1 студзеня па 1 кастрычніка—500 працадзён. Ён атрымаў: жыта—300 клгр. (яшчэ атрымае 200 клгр.), бульбы—2.000 клгр., бручкі—1.500 клгр., капусты—250 клгр., яблык—100 клгр., сена—1.250 клгр., салемы — 160 клгр. і авансам—1.000 руб.

Ударнік **Раўноў Андрэй** (брыгада № 1) у мінулым годзе моў 218 працадзён, а сёлета 400. Ён атрымаў збожжа 240 кгр. (яшчэ атрымае 160 клгр.), бульбы 1.600 клгр., бручкі—1.200 клгр., капусты—200 клгр., яблык—80 клгр., сена—1.000 клгр., салемы—126 клгр.і авансам 800 руб.

Ня меншы даход маюць і ўсе іншыя ўдарнікі і ўдарніцы: **Еўдакімава Юсьцінья, Раўкоў Л., Катовіч Леанідзія, Ковалёва Яўгенія, Цярэшчанка Ягор, Рыхлінскі Сьцяпан.** Іх у калгасе шмат.

З зайздрасьцю на іх пазіраюць ліквідарнікі, гультаі і п'яніцы. **Удакоўская Юсьцінья** выпрацавала толькі **5 працадзён**, а **Крыжэвіч Кацярына—4 працадні.** Відомы спакуліянт **Брэндэй Яўхім** (ён заместпрацы ў калгасе часта сьвідзіў у Лепінгрэ і займаўся спэкуляцыяй) разам з 5 працадзённымі членамі сям'і выпрацаваў толькі 215 працадзён. Не адстаў ад яго гарэзьлівы і п'яніцы **Мастыка Ігнат і Мастыка Мікола.**

Усе яны таксама атрымалі выключна на працадзёнх. Але атрымалі мала, таму, што мала працавалі. Трэба спадзявацца, што яны на наступны год поўнасьцю ўлічаць свае памылкі, на прыкладзе перадавых ударнікаў актыўна возьмуцца за працу.

Калгасны гандаль зьявіўся адным з самых магутных матароў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня арцелі. 20 тыс. руб. атрымана за здачу (продажу) дзяржаве прадукцыю. **Ад калгаснага гандлю выручылі 245.000 руб.**

На савецкім базары прадана: бульбы—на 141.988 руб., гуркоў—52.387 руб., морквы — 13.741 руб., капусты —8.967, цыбулі—9.245, буракоў—10.154 руб., мяса —1.436 руб., яблык—3.429 руб.

Авось тыя цэны, па якіх калгас імя Чырвонай армії рэалізоўваў свае прадукцыю: бульба—30-50 кап. клгр., мяса—5 руб. клгр., морквы—40 кап. клгр., бручка — 30 кап. клгр.. і г. д. Гэта значна ніжэй базарных цэн. На адным толькі апошнім кірмашы рэалізавана прадукцыі на 7.000 руб.

Калгас даўно выплаціў сельгаспадатак, страхоўку і інш. абавязковыя плацяжы. Куды-ж патрачены астатнія грошы, атрыманыя ад калгаснага гандлю?

Выдана авансам калгаснікам па працадзёх—110 тыс. руб. На будаўніцтва школы выдаткавана 10.000 руб. На электрафікацыю Альгоўскай школы і сёлак Батрукі і Альгова —5.000 р. На закупку сельгасмашын—15.000 руб., акцый Трактарацэнтру —7.000 руб., пазыку—7.500 руб. і на розкае будаўніцтва—7.000 руб.

Апрача таго, закуплена 400 кар абутку, 1.500 кавалкаў мыла і інш. прамтавараў (галоўным чынам, вопраткі) на суму 25.000 руб. І ў калгасе яшчэ засталося 85.000 руб. на бягучым рахунку ў банку.

Лічбы красамоўна гавораць аб перавагах калектыўнай працы. Калгаснікі атрымалі-б значна большую даходнасьць, калі-б актыў па змагаўся за павышэньне ўраджайнасьці.

Змагла-ж сёлета брыгада № 1 атрымаць 1.900 пуд. буракоў з гэктара, у той час, як пры аднолькавых умовах брыгада № 2 атрымала толькі 750 пуд.

І вельмі буйную памылку дапусьціла праўленьне калгасу, калі яно не зрабіла аценку працадня ў залежнасьці ад выніку работы, ад ураджайнасьці атрыманай кожнай брыгадай паасобку. Аценка працадня брыгады № 1 таксама-ж, як і брыгады № 2.

Даная памылка лічыцца ўлічана іншымі калгасамі Віцебшчыны.

Арн. Зарубежны, Рыг. Вярхоўскі.

Падпісаньне франка-савецкага дагавору аб ненападзе

БЭРЛІН, 29. У міністэрстве замежных спраў, у «Зале часов» прысутнічала некалькі соцень журналістаў, кіно-апаратараў, дзе адбылося падпісаньне франка-савецкага дагавору аб ненападзе, а таксама ўзгаджальнай канвэнцыі. Дагавор падпісан з боку Савецкага саюзу паўпрэдам—Даўгалеўскім, з боку Францыі—старшынёй рады міністраў і міністрам замежных спраў Эрыё.

Перагаворы аб стварэньні ўраду працягваюцца

Магчымасьць стварэньня ўраду Шлейхэрам

БЭРЛІН, 30. Сёньня адбудзецца сустрэча Шлейхэра з Гітлерам. Мэта сустрэчы — высьветліць, у якой форме Гітлер згодзіцца падтрымліваць габінэт пад кіраўніцтвам Шлейхэра і ці можна наогул спадзявацца на такое падтрыманьне з боку Гітлера. «**Дэйчэ Альгемэйне цэйтунг**» піша, што ў даным выпадку гутарка ідзе толькі аб тым, каб высьветліць, «у якія формы выльецца апазыцыя кансэрвацыйна-сацыялістычнай партыі да ўраду, або гаворачы больш дакладна, ці застанецца гэта апазыцыя ў ціслейшым у рамках лояльнасьці». Газета падкрэсьлівае, што ўрад гатоў кампэнсаваць Гітлера за падтрыманьне ўраду Шлейхэра абяцаньнем працастасьць яму кіраўніцтва Прускім урадам. З другога боку, — падкрэсьлівае газета, — і Гітлеру трэба ўлічыць, што ўрад Шлейхэра можа адкрыць перад ім шырокія перспэктывы».

Яшчэ да спатканьня Гітлера са Шлейхэрам нацыянал-сацыялістычная прэса робіць рэзкія выпады супроць магчымасьці стварэньня габінэту Шлейхэра. Уся нацыянал-сацыялістычная прэса заяўляе, што «ператаваньне можа прынесьці толькі Гітлер». І таму яны супроць усякіх «экспэрымэнтаў», ці будуць яны праводзіцца рэйхсканцлерам Папэнам, ці Шлейхэрам».

Пры гэтым «Ангрыф» пагражаюча дадае: «Калі-ж урад паспрабуе, перайсьці да нелегальных мэтадаў — крымусова адтэрмінаваць рэйхстаг і г. д., дык яму трэба ўлічыць, што ў сілу неабходнасьці і другі бок уступіць на нелегальны шлях». Прэса ўстрымліваецца ад усялякіх прадказаньняў адносна магчымага результату перагавораў Шлейхэра з Гітлерам.

Буржуазная «Цэольф ур блят» піша: «Усё пакрыта «мракам неизвестности». Адно застаецца ясным — становішча за апошнія дні настолькі абвастрылася, што нават у тых колах, якія да гэтага часу глядзелі на разьвіцьцё падзей з поўным аптымізмам, зараз сур'ёзна ўстрывожаны з прычыны магчымасьці палітычных хваляваньняў».

Як паведамляе прэса, сёньня пасьля сустрэчы Шлейхэра з Гітлерам адбудзецца сустрэча Гіндэнбурга з Шлехэрам і фон-Папэнам. Яны зробяць прэзыдэнту справаздачу аб результатах перагавораў, якія яшчэ ня ведаюць.

Што датычыць перспэктыў стварэньня ўраду пад кіраўніцтвам фон-Папэна, дык у той час, як усе дэмакратычныя, нацыянал-сацыялістычныя і рад правых газэт, у тым ліку «Дэйчэ Альгемэйне цэйтунг» рэзка выказваюцца супроць назначэньня фон-Папэна, колы, што стаяць за «Крэйц-цэйтунг» (орган «Сталёвага шлему») па-ранейшаму патрабуюць яго назначэньня. Між іншым сёньня «Крэйц-цэйтунг» заяўляе: «Лёзунгам сёньняшняга дня павінен быць не Папэн, ці Шлейхэр, а «і Папэн, і Шлейхэр», гэта значыць, габінэт, які абяднае лепшыя нацыянальныя сілы».

Становішча дзяцей у Германіі

Паводле анкетных вестак Міжрабпому ся род Нэйкёльнскіх рабочых аказалася, што з 200 дзяцей—**170 ня маюць ложкаў, 175 ня маюць зімовай вопраткі, 94 ня маюць абутку, 65 маюць толькі адну рубашку і павінны заставацца ўдзень у ложку, покуль матка не памые яе.** 43 не ядуць нічога гарачага перад уходам у школу, 56—нічога ўдзень не ядзяць—ні халоднага, ні гарачага. 82 з больш пячаськівых атрымліваюць халодную закуску. Бацькі 3.513 вучняў школы ў Лісьвінайдзе ва ўзросьце ад 6 да 14 год расказалі, што 79 дзяцей заняты дома на розных фабрычных работах, 120 зарабляюць па некалькі пфэнігаў на даручэньнях, 74 займіцца гаспадараньнем, 49 служаць вяньгамі, 18 заняты па фэрмах, 9 у канторах да і пасьля школы.

Сотнямі ва ўсіх гарадох можна сустрэць гэтыя нізначныя пасьцці, якія апрыбываюць дзьверцы аўтамабіляў, прапануюць пасажырам мэтро, цукеркі, газэты. Шмат з іх жабруюць, хаваючыся ад паліцыі, і займаюцца прастытуцыяй. Прэса фінансавага капіталу ня спыняецца на гэтым сацыяльным нішчасьці і нічога не гаворыць аб тых **600.000 бяспрытульных,** якіх блукаюць з гораду ў горад, з фэрмы на фэрму, шукаючы кавалку хлеба.

1.855 год катаргі для рэвалюцыйных рабочых

Балянс дыктатуры Папэн-Шлейхэра за 11 тыдняў

БЭРЛІН. Юстыцыя фашысцкай дыктатуры Папэн-Шлейхэра пакінула за сабой з-заду ўсё, што нямецкі рабочы рух вёдае на працягу сваёй 70-гадовай гісторыі. За час 12-гадовага існаваньня бісмаркаўскага закону супроць сацыялістаў было вынесена над рабочымі прыгавораў **на 1.000 год.** Уведаньня Эбэртам асобныя суды вынесьлі над германскімі рабочымі прыгавораў на **3.000 год.** На падставе рэспубліканскага закону Зэвэрынга 5.000 левых рабочых былі прыгавораны да 7.000 год катаргі. Па працягу **толькі 8 тыдняў** дзейнасьці Папэн-Шлейхэра вынесена больш прыгавораў, чым за час дзейнасьці бісмаркаўскага закону.

Катаржныя прысуды над рэвалюцыйнымі рабочымі сыплюцца ў Германіі, як з «рога изобилия». Толькі за адзін дзень 5 лістапада ў Фердэне тры рабочыя былі прыгавораны **да 30 год катаргі кожны.** У Цэндэлгу на працэсе трох рабочых пракурор зьвярнуўся да суда з наступнымі словамі: «Вы атрымалі меч, увайдзіце яго прыстасаваць». І буржуазія шырока карыстаецца гэтым у сваёй барацьбе супроць рабочай клясы. Па ведае статыстыкі, за час **з 17 жніўня па 9 лістапада 55.000 рабочых былі прыцягнуты да адказнасьці, 9.000 было арыштавана.** За гэты час адбылося **560 працэсаў, па якіх 3.602 рэвалюцыйныя рабочыя засуджаны на 1.855 год катаргі і крэпасьці.**

Сярод асуджаных ёсьць 230 рабочых рэйхсбанэра, 42 жанчыны, 3 рабочыя з хрысьціянска-сацыялістычнай партыі.

«Ротэ фанэ».

Яўрэйскія пагромы ў Львове

Некалькі чалавек забіта, 80 паранена

ВАРШАВА, 29. У сувязі з забойствам у Львове нацыяналістычна настроенага студэнта-паляка Градкоўскага злачынцамі яўрэйскай нацыянальнасьці, эндэцкая арганізацыя разгарнула палёную антысэмітскую прапаганду. Учора **ў Львове выбухнуў яўрэйскі пагром, якім кіруюць эндэкі. Некалькі яўрэяў забіта і каля 80 чал. паранена.** Фашысты-студэнты пашырылі свае пагромкія выступленьні таксама і на ўнівэрсытэт, **зьбіваючы студэнтаў-яўрэяў.** У варшаўскім унівэрсытэце і ў іншых вышэйшых навучальных установах таксама адбыліся ўчора антысэмітскія выступленьні фашысцкіх пагромшчыкаў. (ТАСС).

У Жлобіне акапаліся вялікадзяржаўнікі

У мія да вялікадзяржаўнага шавінізму ў пяперашніх умовах прадстаўляе для нас галоўную небяспеку. Барацьба з гэтым ухілам — перашчарговая задача партарганізацыі. Аб гэтым яшчэ раз падкрэсліў «акавіцкі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, абавязаўшы партыйныя арганізацыі павесьці **«яшчэ больш актыўную барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам, выкрываць перад шырокімі працоўнымі масамі ўсю яго рэакцыйнасьць, карэньні, гістарычнае паходжаньне і г. д., а таксама нанесьці рашучы ўдар апартуністычнаму прымірэнцтву да праяўленьняў вялікадзяржаўнага ўхілу».**

У Жлобішчыне выкананьню гэтых дырэктыў партыі перашкаджалі «чарговыя гаспадарча-палітычныя кампаніі», «адсутнасьць часу» і інш. «аб'ектыўныя» прычыны.

Нашчэньні «адтаворкі» характарызуюць самых работнікаў. Гэтыя адтаворкі некаторых работнікаў са жлобінскага партыйнага кіраўніцтва набываюць выразны характар, калі звяжаць факт актывізацыі дзейнасьці вялікадзяржаўнікіх і інш. шавіністычных элементаў на Жлобішчыне з другім упартым фактам: у Жлобінскім раёне кулаку лёгка і весела жывецца. А гэта характарызуе кірунак «правядзеньня базавых гаспадарча-палітычных кампаній» у раёне.

Наўмо некалькі характэрных фактаў.

Выкананьне раёнам гадавога пляну загатовак на цьвёрдых заданьнях не перавышае 24,6 проц., а ў радзе сельсаветаў (Каратковускі і інш.) ледзь дасягае 5 проц.

Не адчувае кулак, цьвёрдазаданьнік амаль што ніякага націску. Які-ж можа быць націск, калі ні прэзыдыум РВК, ні РК КП(б)Б выкананьнем пляну загатовак па цьвёрдых заданьнях па цікавіліся. Які-ж можа быць націск, калі сам прэзыдыум РВК, а самкіні сакратара райкому партыі Жыракова, дапамагаў сваякоўнічаць кулацтву на раёне.

Мы ня будзем доўга гаварыць аб падзеях мінулых дзён, калі прэзыдыумам РВК з дапамогай Жыракова былі адноўлены ў правах з кулакі Міхайлоўскія (Малоўскі сельсавет), якія потым правялі ў калгас і там сэзаўлівалі, раскрадвалі калгасную маёмасьць.

Мы ня будзем доўга спыняцца на фактах прыпіхоўных дзён, калі той-жа сакратар РК КП(б)Б імкнуўся абаронить начальніка міліцыі Мікуліча за яго ўпэр-прыпыбеўскія дзейнасьць у часе загатовак (арышт бедняка-селяніна, недапушчальнае адміністраваньне).

Гэтыя факты сказэньня ўласавай лініі партыі зьяўляюцца адлюстраваньнем усёй лініі цяперашняга кіраўніцтва Жлобінскага райкому і РВК. А гэта лінія асаблівя яркі выяўляецца на участку культурна-нацыянальнага будаўніцтва, у практыцы правядзеньня, гэрнеей кажучы, сказэньня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

1. „Тэорыя" Сенажанскага на практыцы

Пачнем з нацыянальных сельсаветаў. Іх на Жлобінскім раёне два: **Сенжатнэўскі — польскі і Стрэшынскі** — яўрэйскі.

У першым—польскім — амаль уся работа сельсавету, партыйная ячэйка, хаты-чытальні вядзецца на зьмешанай беларуска-расійскай мове, хоць там каля 70 проц. польскага насельніцтва.

Нам не ўдалося палавярыць з самім старшынёй сельсавету, чаму ў польскім сельсавеце існуе польская мова. Сакратар-жа сельсавету **Сенжанскі** зусім сурёзна і ўпэўнена заявіў:

— Непатрэбна нам польская мова. Непатрэбны польскія школы. Калі мы будзем вучыць народ на польскай мове, мы толькі больш будзем распаўсюджваць рэлігію сярод польскага насельніцтва. Кожны палак, які навучыцца чытаць па-польску — навучыцца чытаць і кнігі чыту. А гэта на руку кулацтву. Я прапаную зрабіць адзіную мову.

На высокім узгорку, пры ўезьдзе ў польскую вёску Антоны стаіць стары касьцёл. Акружаны ліпамі, з крыжом і «па нам Езусам», касьцёл узвышэнца над вёскай, пісьне сваімі вежкімі трэшчынамі.

Дзейнасьць касьцёлу, работа клясава-варожых элементаў асабліва ажывілася ў апошні час. Актывізацыя Дзеравяніна, касьцёльная арганізацыя. Ды не ўдалося знаходзіцца значная частка польскай моладзі. Касьцёл распаўсюджвае сярод калгасьнікаў і адпасобнікаў мясцовы шавінізм.

Тэорыя Сенажанскага падкрэпае гэты шавінізм, грае на руку клясава-варожым элементам. Бо гэта тэорыя праводзіцца і на практыцы.

Аб работе сельсавету сярод палякаў гаворыць толькі некалькі польскіх лёзунгаў у хаце-чытальні. Ды як можа хата-чытальня праводзіць работу на польскай мове, калі сам сакратар партячэйкі (ён-жа і хатнік) т. Мацтулаў ня ведае польскай мовы?

Работа па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці зусім не праводзіцца. Нашу ўлічку малапісьменных, ды створаны лікпункты і школы для малапісьменных.

У сельсавеце дзве польскія школы. Антуфоўская семігодка на сёньняшні дзень ня мае падручнікаў на польскай мове, адсутнічае маляўнічаньне для паліграфіцыі, не хапае настаўнікаў.

Шкодзільць шкаляцельскіх адносін раёна да нацыянальных школ асабліва праявіў ся ў Чарцескай 2-камплектнай школе. Дзіўна, чому раёна ня ўжыў ніякіх захадаў, каб наконцыць з тым калецтвам дзяцей, якое адбываецца ў гэтай школе.

Настаўніца Дамброўская — чалавек, які на можа праводзіць у жыцьцё настанову партыі аб школе. Больш таго, яна супраціўляецца выкананьню гэтых настаноў, ня прымае плянаў работы і раскладу заняткаў, не разумее неабходнасьці аўладаньня дзецьмі асновамі навук.

Аб якасьці яе выкладаньня сведчаць наступныя факты: скончыўшы школу на лежаць простых дробаў, элементарных рэчаў па геаграфіі.

У мінулым годзе ні адзін скончыўшы Чарцескую школу вучань ня ўмеў на сваёй мо-

2. „Калуга вінавата"

На Жлобінскім чыгуначным вузле адкрыта і ігнаруюць беларусізацыю.

У розных формах, вырасах адкрыта і схавана некаторыя работнікі чыгункі імкнуцца даказаць, што «інтэрнацыяналізацыя» нашай культуры робіць непатрэбным развіцьцё нацыянальных культур. На чыгунцы, бачыце, спэцыфічныя ўмовы, якія робяць непатрэбным беларусізацыю. «Нават дырэкцыя ледзь знаходзіцца ў Калузе... Шчэ-м вы патрабуеце ад нас, каб мы пісалі па-беларуску?» — заявіў нам, начальніка станцыі вуху **Пякурын.**

Між тым, жлобінскі чыгуначны вузел чае больш 75 проц. рабочых-беларусоў. Работа-ж

мясцкому, парт'ячэйкі праводзіцца амаль выключна на расійскай мове. Чому **на расійскай,** калі з 1.190 работых дома толькі 120 расіяцаў?

Намесьнік старшыні мясцкому дапамагае:

— Мы толькі два гады, як услухаем беларусскай язык (?). Как-же сейчас мы должны его знать».

Яго падтрымлівае **Бачэроў,** кацельшчык, член партыі, які 15 год жыве ў Беларусі:

— Мне не нравится белорусский язык. Труд по нем ломать. Вот, например «нарыхтовка»... что это за слово?

Бачэроў гэта кажа са сьмехам. І ў гэтым сьмеху адчуваецца: ніхто такім выказваньням не даваў дагэтуль супраціўнага, большавіцкага адпору. А можа быць і сам раб ня Бачэроў, хаця і член партыі, дагэтуль добра не зразумеў шкодніцкай рэакцыйнай сутнасьці такіх адносін да беларусізацыі?

Масавай работы на растлумачэньні ленінскай нацыянальнай палітыкі і ў дапо, і ў работнікаў няма.

Апрацаваньня гэтаму зьявішчу старшыня мясцкому дапо і яго намесьнік шукаюць у «аб'ектыўных» прычынах: рабочыя разкіданы па далёкай адгласьцы. Цяжка ахапіць».

Між тым, варта хаця крыху прыслухацца, што гаворыць аснова мясцкому рабочых, радныя члены партыі, — каб упэўніцца, што самі кіраўнікі дапо стварэюць гэтыя «аб'ектыўныя» прычыны.

Тав. Старасьценка — прафорг парэзьня ОВ 6271, — заявіў:

— Я хапку на месячныя курсы прафоргаў. Там усе прадметы выкладаюцца на расійскай мове. Беларускіх гурткоў няма. Дзе-ж вучыцца граматна пісаць і гаварыць па-беларуску?

Вось, напрыклад, як піша тав. Старасьценка:

«Т. Рутковскому.

Політ заняткі прафорга приходят на ступныя числа... пізбходна являтся на нездных числах указаных встроке».

Зусім напісьменна піша тав. Старасьценка, а хоча пісаць правільна. Але-ж ні ячэйка, ні мясцком ня ідуць насустрэч жаданьню рабочых вывучаць беларускую мову.

Тав. Брэжывальскі, парэзьнік, жыве ўсюды ж у Беларусі, таксама ня згодзен з «аб'ектыўнымі» прычынамі старшыні мясцкому дапо.

— Возьмем наши сходы ячеек цагі, тэпо, паровозная... Усе яны праходзяцца амаль выключна на расійскай мове. Па-беларуску гаворыць толькі Танкаў Рыгор, Янушка, Міхалюк, ды я. Настаноў аб беларусізацыі на паперы шмат. Але ні адначэ разу пытаньне гэта ня ставілася ячэйкай так, як патрабуюць дырэктывы партыі. У мясцкоме парадзіцца у мінулым месяцы ня вялісеі ні адзіна аб зоміляра «Зьвязды». Тэхнічныя гурткі на аўта-тармазох, на тэхнічнай эксплёатацыі займаюцца на расійскай мове. Якім-ж тут могуць быць «аб'ектыўныя» прычыны, калі нічога ня зроблена, каб справу беларусізацыі зрушыць з мёртвага месца?

Тэхні-ж, прыкладна, малюнак работы і сярод рабочых руху, у вагонным парку. Тут таксама ня выпісываюць ні адзінага экземпляра беларускіх газэт. Сакратар парт'ячэйкі руху Бугук, арганізатар масавай работы Шыбінскі заяўляюць, што нічога ня робіцца у галіне беларусізацыі. Няма часатай работы на растлумачэньні нацыянальнай палітыкі партыі. Але прызнаваецца у памылках і на гэтым супакойваецца стала ўжо да некаторай ступені «сьмела».

Наконт службы руху ёсьць спэцыяльная настанова нацкамісіі РВК пра неньканьне дыскусіі аб беларусізацыі. Начальнік станцыі Пякурын добра ведае аб гэтай настанове, але ўпэўнена яе ня выконвае.

— Чому ня выконваю? Па-першае, дырэкцыя чыгункі ў Калузе. Яна піша па-расійску. Па-другое — сам ня ведаю беларускай мовы.

Сваё нежаданьне праводзіць беларусізацыю ён стараецца прыхаваць наперакі: загадамі з Калугі і толькі што атрыманай паперкай на расійскай мове ад партарганізатара шостага экспэдыцыйнага вучастку Прудніка.

— Вы ад нас патрабуеце, чому самі партыйныя кіраўнікі пішуць нам па-расійску?

— Ён паказвае загады, падпісаныя начальнікам раёну Аламовым, нам, начальніка Соблевым і яшчэ раз кажа:

— Бачыце? Само начальства русыфікавае.

Так супраціўляецца беларусізацыі хаваюцца за сьпіну кіраўніцтва райканторы чыгункі. Мощная, вырокая шыльда. Я ня мы і пачнем.

Нам прышлося набываць у некалькі адзьелах райканторы чыгункі і ўсюды, куды мы прыходзілі, чулі ўжо здзёмае:

— Мы не пінаваты, Калуга вінавата, Калуга піша па-расійску. Нам трэба па-беларуску, ну і выкасіць у нас нешта начыпіт вэнігрэтуплць слоў па-расійску, тры па-беларуску...

Вось, напрыклад, якія адносіны піша начальнік фінансавага аддзелу Сарджоў:

«Згодна распараджэньня дырэкцыі спыніте адпасіць выдатак на сялежаньню алімо бухгальтэра за рахунак ЦСУ-ss».

І такія «адносіны» пасылаюцца на месцы. Ня дзіўна пасьля гэтага чому дзяжурныя па станцыі часам перабліваюць тэлефонны дзеньня. У маленькім абзацы (слоў 12) аднаго загаду мы налічылі 10 грубейшых граматычных памылак беларускай мовы.

У аддзеле шлях (вагонная група) нават ня ма ні адзінага беларускага лёзунгу.

Кіраўнік групы інжынер Красьнеўскі, каца і жыхар Беларусі, ухіляецца ад беларусізацыі. У яго ёсьць свае ўзаблёнкі на гэта прычыны:

— Беларускую мову трэба вывучыць, а ў мяне часу няма. Дый яшчэ ёсьць адна перашкода: калі я напішу пісьменную паперку, з мяне, як кіраўніка, будуць толькі сьмяяцца. Тому больш важную паперку пішу па-расійску...

Так інжынер з вышэйшай асьветай хаца прыкрыцца... нішчэ мелкасьцю.

Такі-ж малюнак і такія-ж прыкладны адтаворкі і у аддзеле шляху, цягі, раённай канторы, у аддзеле фінансаў, кадраў, у аддзеле працы.

Сам сакратар парт'ячэйкі канторы дае «прыклад»: піша і гаворыць амаль выключна па-расійску.

А тав. Катаноўн — старшыня мясцкому канторы, шчыра заявіў:

— Раней сёе-тое мы рабілі у галіне беларусізацыі. Цяпер поўны заняпад.

Канстатуюць, б'юць себе у грудзі. І... нічога ня робяць. А калі пачуюць, што супраціўленьне беларусізацыі ёсьць праяўленьне вялікадзяржаўнага шавінізму, зробяць спалоханы твар і пачынаюць даказваць:

— Мы не пінаваты. Вінавата Калуга...

Ні адзінага разу партарганізацыя канторы не абаварала пытаньня беларусізацыі. Мясцовыя работнікі, якія супраціўляюцца дырэктывам ураду аб беларусізацыі, ня прыцягнуцца да адказнасьці. Лібералізм, прымірэнцтва да праяўленьняў вялікадзяржаўнага шавінізму зьявіў мочнае ўзнёсь у райканторы чыгункі.

3. Лінія райкому партыі

Пытаньні правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі зусім ня маюць месца ў праграме дзеяньня райкому партыі. Сам сакратар РК Жыракоў нам заявіў:

— На працягу дзевяці месяцаў, калі я тут у Жлобіне працую, мы гэтымі пытаньнямі не займаліся.

«Гэтыя пытаньні» былі аддадзены нацыянальнай камісіі РВК «да выкананьня». Нацыянальная-ж камісія, якой ніхто не даваў і ні настаноўмі якой ніхто ня кіруе, фактычна не існавала.

Таму зусім ня дзіўна, чому у раёне няма кіраўніцтва нацыянальнымі сельсаветамі, чому ў горадзе, дзе больш 300 сем'яў польскіх рабочых, няма ні адная польская школы, абсалютна ніякай работы не праводзіцца сярод працоўнага польскага насельніцтва, чому значны процант яўрэйскіх дзяцей вучацца ў беларускіх школах.

У свой час нацыянальная камісія РВК, абсьледаваўшы жлобінскі клюб сематуміцкі, канстатавала адсутнасьць усякай работы клюбу сярод нацменшасьцяй. Нацкамісія тады ўхвалила: «Прасіць РК КП(б)Б увяцьцяйчаць на парт'ячэйку Самураму за кіданьня адносіны да кіраўніцтва клюбу. Давесьці да ведамі Белсамрамсаюзу аб недапушчальнай бязьдзейнасьці і апартуністычных адносінах Рагачоўскага аддзяленьня Самураму да работы па абслугоўваньні нацменшасьцяй арцелям Жлобінскага раёну».

Настаноўы нацкамісіі так і засталіся на паперы. Работа з арцелямі, клюбамі — у пазьменным становішчы.

Тая-ж нацкамісія сьпіталізавала перад РК КП(б)Б і РВК аб поўнай бязьдзейнасьці раёна ў рабоце па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод нацменшасьцяй. У раёне 3.000 няпісьменнага насельніцтва. Улік няпісьменных нацменаў адсутнічае. У раёне нават ня ведаюць, ці ёсьць наогул нацмен. ліквпункты. До гэтага часу раёна не займаўся справай ахопу школамі малапісьменных. А раёнская дарослага насельніцтва, якога налічваецца звыш 300 чал. І толькі пяцер арганізаваліся дзьве групы малапісьменных, якімі ахоплена ўсяго... 20 чалавек.

Нацкамісія сігналізавала, але сігнал «сурэзні моўчкі.

Вось яшчэ некаторыя даныя, якія характарызуюць поўны заняпад работы па культурным абслугоўваньні нацменшасьцяй.

У Стрэшыне (нацыянальны яўрэйскі сельсавет) ёсьць вардом, які абслугоўвае яўрэйскае насельніцтва. Загадчык вардому беларус. Работа праводзіцца на расійскай мове, літаратуры на яўрэйскай мове ў вардоме няма. У Сенажанскім сельсавеце была адзіная ў раёне польская хата-чытальня. На сёньня яна зачынена. Фактычна-ж не працуе.

Надзвычайна ліквідавана яўрэйская Салтанаўская школа. Вось як тлумачыць новы пленум РВК прычыны яе ліквідацыі: «На працягу двух год існаваньня Салтанаўскай яўрэйскай школы, працавалі ў ёй прыезжыя прэкэтанты-настаўнікі, часта з вялікімі перабоямі. Навучальны год пачынаўся са спазьненьнем і канчаўся раней тэрміну. Якасьць працы школы была зусім нізкая. Пасьля ўсяго гэтага дзеці яўрэйскай школы ўчыліся ў Салтанаўскую беларускую школу. Улічваючы, што ўзрост яўрэйскага насельніцтва школьнага ўзросту налічваецца ў Салтанаўцы 10-12 чал. і адсутнасьць яўрэйскага настаўніка — прыйшоў да вывада зачыненьне Салтанаўскай яўрэйскай школы і ўліцьцё ў Салтанаўскую беларускую школу».

РВК прыхаваў пачатку, калі ўжо яўрэйская школа развалілася з-за адсутнасьці настаўніка. Самая лёгкая справа ліквідаць нацыянальную школу, не пасьпяшаючы аб умовах яе існаваньня. Але гэта настанова зусім ня дзіўная, калі прыняць над увагу вышэйсказанае: пытаньні нацыянальнай палітыкі выпалі з праграмы дзеяньня раённага кіраўніцтва.

Нам прышлося набыць на заняткі дзведнага семінару, дзе займаецца выключна партыйны кіруны актыў гораду. Быў урок матэматыкі. Настаўнік, хоць і ведаў беларускую мову, усё-ж гаварыў па-расійску. За ім сьледалі і усе іншыя слухачы. А сярод слухачоў былі: старшыня РВК, народны судзьдзя, інспэктар працы, дырэктар банку, члены райкому КП(б)Б і інш.

Які-ж прыклад астатнім можа даць партактыў, калі сам ён, разам з сакратаром РК КП(б)Б Жыркоўным, ігнаруе беларусізацыю? Мы ўпэўнены, што гэта група нічога не зрабіла, каб узьняць беларусізацыю на вышэйшую ступень, каб ведаць ня толькі беларускую мову, але гісторыю, эканоміку, культуру Беларусі, што необходна кожнаму большавіку. І зусім ясна: у ігнараваньні дырэктыў партыі аб беларусізацыі, рабоце сярод нацыянальных меншасьцяй, аб узмацненьні барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам, беларускім нацыянал-дэмакратызмам і іншымі шавінізмамі, у ігнараваньні гэтых дырэктыў самім райпарткомам, самім партыйным актывам — іменна ў гэтым «сорань усяго таго буйнейшага правалу, які мы маем у Жлобінішчыне на вучастку культурна-нацыянальнага будаўніцтва, на вучастку барацьбы за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі.

***

Мы лічым, што ЦКК КП(б)Б зробіць належныя вывады з таго, як кіраўніцтва жлобінскай партыйнай арганізацыі ажыцьцяўляе важнейшыя ўказаньні сакавіцкага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б па нацыянальна-культурным будаўніцтве.

А. СУЧКОВА.

Напярэдадні ўсебеларускага дня кандыдата

ЗАБЫТЫ КАНДЫДАТ

РЭЧЫЦА. (Наш спец. кар.). Рэчыцкая партыйная арганізацыя налічвае ў сваіх радох 563 кандыдаты або 47 проц. да ўсяго складу. У пласобных ячэйках кандыдаты складаюць 50 процантаў, а то і больш паловы арганізацыі.

У калгасе імя **Калініна** членаў—2, кандыдатаў — 13, у **артукоўскай** ячэйцы таксама, у ячэйцы **«Дзесяцігодзьдзе БССР»** членаў партыі трк. чалавекі, кандыдатаў 14.

324 кандыдатаў у раёне з пратэрмінаваным кандыдацкім стажам; прычым 76 проц. (245 чал.) з іх рабочыя.

У ячэйцы зьмены «в» **запалжазай фабрыкі** ўсе 17 кандыдатаў з пратэрмінаваным стажам (ад 6 месяцаў да году). У парткалектыве **«Х-ты Кастрычнік»** 90 проц. кандыдатаў з пратэрмінаваным стажам. Такое-ж становішча і ў іншых ячэйках як гораду, так і вёскі.

Аспоўнай прычынай заціжкі з пераводам кандыдатаў у раёне лічаць «палітычную непадрыхтаванасьць». Гэтая «матывіроўка» дае права судзіць аб стане выхаваўчай работы сярод кандыдатаў.

Паводле вестак Культпропу гаркому з 563 кандыдатаў ахоплена вучобай 350. У сапраўднасьці-ж наведвае школу яшчэ меншая колькасьць.

У парт'ячэйцы зьмены «г» фабрыкі **«Х-ты Кастрычнік»** ёсьць 18 кандыдатаў, якія наведваюць заняткі вельмі дрэнна. 1, 4, 8 і 22 лістапада з-за адсутнасьці слухачоў заняткі былі сарваны. 24 прышло два чалавекі. На зьмене «в» ахоплена 15 чалавек, наведваюць 2-4. На заводзе «Інтэрнацыянал» з 20 кандыдатаў парт вучобай ахоплена 16, а фактычна наведваюць заняткі толькі 8.

Такіх фактаў можна прывесьці шмат, але і з гэтага відаць, што і райком і парт'ячэйкі Рэчыцкага раёну недапушчальна мала аддаюць увагі вучобе кандыдатаў. Сакратар ячэйкі зьмены «в» т. **Жыдаловіч** пад націскам фактаў вымушан быў прызнаць сваю бязьдзейнасьць. «У маёй ячэйцы — гаворыць ён,—17 кандыдатаў, наведваюць школу толькі **Сафронава, Фальковіч, Бародзіч і Калючыц** і гэтыя былі па заняткам два разы, астатнія таварышы зусім ня ходзяць у школу. У кожнага кандыдата пратэрмінаваны стаж. Партнагрузку мала хто з іх мае. Ёсьць тры заявы, больш месяца яны ляжаць у ячэйцы, ня можам прыняць, бо яны ня зусім аформлены».

Такія фармальныя, казённыя адносіны да прыёму новых кандыдатаў можна сустрэць у многіх ячэйках. Калгасьнік **Шумейка Фядос** падаў заяву ў парт'ячэйку **Караваціцкага** сельсавету 12 лютага 1932 году, ячэйкаю прынят 8 красавіка і ў райком паступіў матар'ял толькі 20 лістапада г. г.

У РК ляжаць нерагледжанымі матар'ялы аб прыёме ў партыю калгасьнікаў **Аляксеенкі Яўхіма** (з 16 мая г. г.), **Дворкіна Адама і Ружыцкага Адама** (з 24 мая г. г.), **Воўкаў Фёдар**—рабочы **хлебазаводу** прынят ячэйкай 5 верасьня 1931 году, стаж—6 месяцаў, дакументы ў РК згубілі і толькі 22 кастрычніка 1932 году па новай заяве Воўкаў зацьверджан кандыдатам. Цімашкоў Міхась прынят па першай катэгорыі 8 сакавіка 1929 г., а пераведзен у члены партыі 25 жніўня 1932 г.

Справа даходзіць да абураючай цеганіны. Так, Сівуха Лоў Мікалаеў, член калгасу «Парастак сацыялізму» ў 1930 г. прынят у кандыдаты партыі (мае кандыдацкую картку), плоціць узносы, наведвае сходы, прымае актыўны ўдзел у грамадзкай і партыйкай рабоце, прэміяваны ўдарнік. 15 лістапада 1931 г. ячэйка перавяла яго ў члены партыі. Матар'ял паступіў у РК. Прыймовая камісія 24 студзеня 1932 г. выносіць пастанову: «прыняць кандыдатам па другой катэгорыі». Сівуху зноў выпісалі кандыдацкую картку. Тав. Сівуха на працягу году ходзіць у райком, патрабуе высьветліць справу. І толькі ў лістападзе г. г. яму ўдалося даказаць, што ён ужо кандыдат з 1930 г.

Гэтаму факту бюракратычнага падыходу да кандыдата партыі райком ня даў палітычнай ацэнкі.

Недысцыплінаванасьць, яўнулата ўзносаў, невыканальне пастаноў, адарванасьць ад партарганізацыі, пасыўныя адносіны да грамадзкай работы, ухіленьне ад партасьветы і ня прыкладнасьць на вытворчасьці займаюць аспоўнае месца сярод прычын пратэрмінаваньня стажу.

З гэтага трэба зрабіць два вывады. Першы аб па зусім сурёзных адносінах да прыёму ў партыю, і другі, самы **галоўны,** аб слабасьці выхаваньня, аб **недаацэнцы** работы з кандыдатамі.

Аб гэтым-жа гаворыць вялікі процант кандыдатаў, прыцягнутых да партыйнай адказнасьці, і мэханічнае выбыцьцё з партыі.

На фанэрным заводзе, напрыклад, з 32 кандыдатаў 4 выбыла мэханічна, 3 выключаны і 6 атрымалі розныя партсягнаньні.

Кандыдаты ў большасьці выдыхаў у работу ня ўцягваюцца, нагрузак ня маюць і гадамі лічацца пасыўнымі. Такія адносіны параджаюць нездаровы настрой і нярэдка прыводзяць да адрыву кандыдата ад ячэйкі.

У Гавенавіцкай ячэйцы, напрыклад, батрачка, кандыдат партыі тав. **Божна** скардзіцца, што не даюць ніякай партработы.

З праверапых 8 вытворчых ячэек, толькі ў адной уплочаны партузносы за кастрычнік. На заводзе імя Томскага з 8 кандыдатаў запазычваюць маюць 6: Лейзаровіч—за шэсць месяцаў, Славін і Каракін—за тры месяцы, Казубоўская і Юдзенка—за два месяцы і г. д.

Кандыдату ня прышчаляюць пачуцьця адказнасьці за захаваньне элементарных і разам з тым, **надзвычай важных** прынцыпаў бальшавіцкай партыйнасьці. А чому б, напрыклад, ячэйкам, райкому не правесьці спэцыяльныя гутаркі аб значэньні партыйных сходаў, выплаты ўзносаў, выканаьня нагрузак. Іменна, на гэтых канкрэтных рэчах трэба вучыць бальшавіцкай дысцыпліне маладога камуніста.

З гэтага Рэчыцкі райком і ячэйкі павінны пачаць **сыстэматычную** выхаваўчую работу з кандыдатамі.

Дашкевіч.

ІНЖ. РОЗІН

РЭДКІЯ МЭТАЛІ Ў БССР І ІХ ВЫВУЧЭНЬНЕ

Апошнія гады характарызуюцца выключнай увагай, якая аддаецца ў СССР так званым рэдкім элементам: тытану, ванадыю, малібдэну, вольфраму, урану, радыю і інш.

Чым-жа выклікана гэта ўвага да групы элементаў і металяў пад назвай «рэдкіх»?

Яна выклікана тымі павышанымі патрабаваньнямі, якія асабліва ў даны момант прад'яўляюцца рознымі галінамі нашай сацыялістычнай прамысловасьці (аўта-авія і дырыжаблябудаўніцтвам і інш.) да якасьці металяў. Наша прамысловасьць патрабуе новых гатункаў высокаякасных сталяй (тытанавых, малібдэнавых, ванадыевых, вольфрамавых), карозій з высокім супраціўленьнем, новых высокаўпорных «зьнішчэрдных» сплавах (сплавы ванадыя з медзьдзю, алюмініем, марганцам, нікелем — ванадыёвыя бронзы для розных мэт і г. д.).

Значныя патрэбы прад'яўлае на злучэньні гэтых элементаў спэцыяльная хімія, фарбавальная прамысловасьць, шкляная, кераміччная, эмаляваная сьвятлатэхніка, вырабы сроднкаў абароны і наогул навейшая якасная мэталургія.

У дарэвалюцыйны час разьведкі рэдкіх элементаў амаль не вялася. Рэдкія металы выключна імпартаваліся, а вядомыя ўжо месцанаклады былі ў якасьці канцэсій перададзены замежнаму капіталу, які браў іх са спэцыяльнай мэтай — пры дапамозе хабарнікаў-чыноўнікаў паралізаваць асваеньне тэхнікай царскай Расіі рэдкіх элементаў.

Адная, як ня значны дасягненьні апошніх гадоў у галіне выяўленьня месцанараджэньня рэдкіх металяў і элементаў, запатрабаваньне, якое павялічваецца на іх з кожным годам, далёка ня можа быць пакрыта прыроднымі накладамі спэцыфічных мінэралаў, калі нават такія існуюць.

З прычыны іх нізкіх запасаў, большая частка рэдкіх элементаў знаходзіцца ў распыленым у вельмі малых долях стане ў розных выкапнях і поўпрадуктах. Знаходжаньня адзнакі гэтых выкапняў і поўпрадуктаў зусім не даюць падстаў меркаваць аб прысутнасьці ў іх рэдкіх элементаў. Гэта можна вывіць толькі лябараторным шляхам.

У адшуканьні і агляды нам перш за ўсё зможа дапамагчы хімія земнай кары — геахімія і геалёгічны прагноз.

Многія рэдкія элементы маюць падвычай хімічную рухомасьць (напр., ванады).

Гэта ўласьцівасьць «міграцыі» дапамагае растлумачыць геахімічную ролю гэтых рэдкіх элементаў у земнай кары, і асабліва ў асадкавых ле народах, якія зьяўляюцца хімічна больш рухомымі, чым выбухлыя народы. Гэта хімічная актыўнасьць і рухомасьць дасьць нам магчымасьць знайсьці іх у такіх мінэральных і арганічных злучэньнях, пра якія раньш было і меркаваць.

Зробленыя ў пошуках рэдкіх элементаў і металяў (пачынаючы з сярэдзіны XIX стагодзьдзя) аналізы гэта пацьвердзілі.

Яны былі выяўлены за многіх мінэральных і горных народах, у тым ліку і асадкавых, у расьсеянай форме, хоць часта яны былі канстатаваны толькі якасна.

Рэдкія элементы, быўшы аб'ектамі толькі тэарытычнага дасьледу, сталі прадметам навукова-дасьледчага і тэхналёгічнага вывучэньня тая задаваленьня вострых запатрабаваньняў прамысловасьці.

Гэтыя-ж моманты былі асноўнымі, што падштурхнулі наш навукова-дасьледны інстытут прамысловасьці заняцца вывучэньнем рэдкіх элементаў у народах БССР.

Асадкавыя народы, як вядома, зьяўляюцца асноўнымі ў БССР, характарызуючымі яе геалёгічную набудову.

Канцэнтрацыя ванадыя, малібдэну і інш. рэдкіх элементаў у асадкавых народах — у асадках морскага дна і інш. — зьвязана была з працэсам адсорбцыі (пагашчэньня) асадкавых народ, так і зьявішчамі ў жыцьці біясферы (сфэра жывой істоты)—са зьявішчамі біяхімічнага нараджэньня і са зьявішчамі геахімічнымі (перасоўваньне элементаў і інш.).

Ня спыняючыся на гэтым пытаньні, таксама як і па прычынах канцэнтрацыі рэдкіх элементаў у асадкавых народах, трэба сказаць, што ў некаторых асадкавых народах (каменны вугаль, асфальты, фосфарытныя жалезныя руды) рэдкія элементы былі выяўлены ў колькасьцях, якія апраўдваюць іх здабываньне.

Каб мець уяўленьне аб каштоўнасьці рэдкіх металяў і элементаў, дамо яна прыклады.

Ванады зьяўляецца ў сучасны момант дарагім імпартным прадуктам. Адзін кілёграм яго каштуе 20 руб. золатам. Кілёграм фэра-ванадыя з 50 проц. утрыманьнем ванадыя — 12 руб. золатам.

Адзін грам радыя (у цэнах 1928 году) каштуе 100 тыс. руб. золатам.

Аднак, здабываньне гэтых расьсеяных элементаў з усяката роду асадкавых народ, руд і адыходаў (шлакаў і інш.) можа быць забясьпечана толькі пры **комплексным** перапрацоўцы апошніх, г. зн. пры адначасовай і поўнай утылізацыі ўсіх складаючых ня толькі рэдкіх, але і наогул тэхнічна каштоўных элементаў. Гэта падштурхнула інстытут прамысловасьці БССР заняцца ў мінулым годзе выяўленьнем рэдкіх элементаў у расьсеянай форме і ў асадкавых народах БССР, каб у далейшым працягнуць вывучэньне пытаньняў комплекснага здабываньня і іншых тэхнічна каштоўных матэрый.

Работа вялася па прапанове і пад кіраўніцтвам інжынэра **А. М. Розіна** навуковым супрацоўнікам тав. **Б. Г. Шэйдалем,** які быў спэцыяльна камандыраван у 1931 г. для вывучэньня мэтодыкі ў лябараторыю рэдкіх металяў інстытуту прыкладной мінэралёгіі ў Маскве.

У якасьці бліжэйшага аб'екта для вывучэньня былі ўзяты гліны. Мэтавая ўстаноўка — ня толькі вынайсьці прысутнасьць рэдкіх элементаў, але і заняцца наступным этапам — выяўленьнем адносінаў іх па якасьць больш каштоўных керамічных вырабаў. Галоўнай-жа мэтай было вывучэньне пытаньняў комплекснага здабываньня з іх як рэдкіх металяў, таксама і лёгкага металю — алюмінія.

Пачатковы этап гэтай работы даў надзвычай цікавыя вынікі.

У адной з дасьледаваных глін, запасы якое даволі значныя, было выяўлена ўтрыманьне вокісі тытана — 4,5 проц., вокісі ванадыя — 0,16 проц. і цырконія — 0,1 проц.

Гэта частка тытана і ванадыя гаворыць аб тым, што мы тут маем справу з мінэральным сырцом, які можа быць адносна да руд рэдкіх элементаў (ванадыю).

Прысутнасьць гліназему робіць гэты сырэц асабліва цікавым у адносінах комплекснага выяўленьня алюмінія, ванадыя, тытана і цырконія.

Для характэрыстыкі каштоўнасьці гэтага адкрыцьця трэба сказаць, што ў **Амэрыцы** і інш. краінах лічыцца ўжо эканамічна мэтазгодным распрацоўваць пасады, у якіх **ёсьць 0,1 проц.** ванадыя. Нашы керчанскія жалезныя руды маюць **0.03—0,1 проц.** ванадыя. Адна тона ўральских тытана магнэтэлу дае **600 кгр.** сталі, **100 кгр.** вокісі тытана і **1 кгр.** ванадыя. Адна тона гліны, дасьледаванай нашым інстытутам прамысловасьці, можа даць **250 кгр.** гліназему, **45 кгр.** вокісі тытана і **1,6 кгр.** ванадыя.

Па пытаньні вывучэньня рэдкіх элементаў і зьвязаных з імі лёгкіх металяў (алюміні) інстытут прамысловасьці БССР зьвязаўся з рэдкі навукова-дасьледчымі інстытутамі Саюзу, якія вядуць працу ў гэтай галіне.

Цікавы поўтук саюзнага інстытуту рэдкіх металяў ад 5 кастрычніка 1932 г. Ён правёў работу па ванадыі керчанскіх жалезных руд. У сфэру яго дзейнасьці ўвайшлі і медныя пяшчаніі, вугалі і інш. Старэйшы кіраўнік работ па ванадыі **праф. М. М. Собалеў** піша: **«паведамленьне аб беларускім мінэральным сырцы, маючым у сабе тытан, ванады і алюміні, які патрабуе комплекснай пераапрацоўкі, мае значную цікавасьць». Таксама і інстытут прыкладной мінэралёгіі (сэктар комплексных руд) выкес заключэньне аб мэтазгоднасьці ўвядзеньня назукова-дасьледчай работы па вывучэньні мэтадаў здабываньня ванадыя, тытана, алюмінія з мінэральнага сырцу БССР і прапанаваў сваю кансультацыйную дапамогу па ўсіх пытаньнях, зьвязаных з гэтымі элементамі** (паведамленьне інстытуту ад 9 кастрычніка 1932 г.).

Улічваючы геалёгічныя ўмовы БССР, кіруючыся пры гэтым прынцыпамі геахэміі і біяхэміі, якія гавораць аб перасоўваньні

АГРАНОМ СЯДЗІЦЬ У КАНЦЫЛЯРЫІ

Меркаваньне Наркамзему і „дзейнасьць“ Пухавіцкага райза

Цэнтральны Камітэт нашай партыі надрэсьліў, што яўсьць у сельскай гаспадарцы — цэнтральная задача. Ня справу ўздыму ўраджайнасьці налёў трэба ўсьвяць масы калгаснікаў і рабочых саўгасаў. Трэба дапамагчы ім аўладаць агратэхнічнымі ведамі, бо бяз гэтага нямысьліма выкананьне пастаўленай задачы.

Зімовы перыяд павінен быць выкарыстан у калгасах і саўгасах з максымальнай эфэктыўнасьцю для агратэхнічнай вучобы.

Наркамзем БССР пастанавіў правесьці вопытную вучобу ў адным раёне. Такім раёнам выбран Пухавіцкі, як найбольш падыходзячы для гэтай справы. У раёне ёсьць 42 спэцыялісты, 2 тэхнікумы: —садова-гародны і мясабітагадоўчы, запальная станцыя і вялікая сетка саўгасаў.

Для гэтай мэты Наркамзем камандыраваў у Пухавіцкі раён 4-х сваіх работнікаў. 21 кастрычніка была склікана канфэрэнцыя спэцыялістаў. На канфэрэнцыі былі распрацаваны планы правядзеньня агратэхвучобы. Намецілі арганізаваць 462 сельскагаспадарчыя гурткі ў калгасах і саўгасах, абслужваць раённы агрэгабінэт. Для кіраўніцтва ўсёй гэтай справай павінна створана пастаянная вытворчая камісія з прадстаўнікоў МТС, РКС, запальнай станцыі, райкому партыі, камсамолу і прафарганізацыі, пад кіраўніцтвам райза.

На канфэрэнцыі спэцыялістаў загадчык райза пінат гаворыў аб вызваленьні агранома ад канцылярскай справы. З 15-га лістапада сельсава-гаспадарчыя гурткі павінны распачаць работу.

Прайшло даволі часу. Наркамлемаўцы пазнумелі ў раёне і паехалі ў Менск, а справа з агратэхвучобай у вопытна-паказальным раёне (калі можна яго так назваць) не пасунулася наперад ні на крок.

Аграгабінэт не арганізован. Няма для яго памяшканьня і няма сродкаў для абсталяваньня. Райгаранам па-ранейшаму сядзіць у канцылярыі і за арытмометрам і паперамі ня бачыць жывой справы.

Брыгадзіры, якія паехалі арганізоўваць гурткі, у раён не вярнуліся і вынікі арганізацыі гурткоў невядомы. А праграмы гурткоў даволі вялікія. Далей цягнуць, г. зн. проста сарваць зімовую вучобу ў саўгасах і калгасах.

Райза на кіруе агратэхвучобай. У часе правядзеньня дня ўраджаю і калектывізацыі памячалася шчат мерапрыемстваў па раёне: правесьці куставыя сходы калгаснікаў, сходы ў калгасах сумесна з працоўнымі аднаасобнікамі, з мэтай падагуленьня гаспадарчага году ў калгасах.. У пяці месцах раёну мерацалася наладзіць выстаўку коняй.

Для правядзеньня гэтай работы пры райза была складзена спэцыяльная камісія. Камісія бязьдзейнічала і ў выніку намечаныя мерапрыемствы засталіся добрымі пажаданьнямі.

Нам здаецца, што так праводзіць паказальную агратэхвучобу, зусім не да твару і Наркамзему і **пухавіцкім кіруючым раённым арганізацыям.**

Зьн. Бызалы.

„Не распрацавалі... ня ведаем“...

РЭЧЫЦА. (Наш кар.). Ня запытаньне, што зроблена па арганізацыі агратэхвучобы ў раёне, загадчык райза тав. **Тамілаў,** доўга ня думаючы, адказвае: «Яшчэ нічога ня зроблена. Мы гэтага пытаньня не распрацавалі».

Ня лепш справа і па МТС. Старшы аграном тав. **Папругайла** кажа: «Я нічога ня ведаю пра становішча агратэхвучобы, бо ў калгасах ня бываю. Я ўвесь час сяджу ў райвоньне або ў канцылярыі».

Не адстаў і райкалгассаюз. Старшыня яго тав. **Равёнак** замест канкрэтнай дзейнасьці займаецца меркаваньнем аб тым, што раней студэнта агратэхвучобы ў калгасах не пачнецца.

РК КП(б)Б нізкіх захадаў да ажыцьцяўленьня важнейшай пастановы партыі аб павышэньні ўраджайнасьці ня прыняў. Культпроп РК яшчэ толькі думае склікаць нараду па гэтым пытаньні.

У раёне няма ні аднаго калгасу ці саўгасу, дзе быў-бы створан хоць адзін агратэхнічны гурток. Пастанова партыі пра павышэньне ўраджайнасьці сярод калгаснікаў не рэалізавана.

Магчымасьці для арганізацыі гурткоў па вывучэньні агратэхнікі ў раёне ёсьць. У Жмураўскім, Засьлянскім, Васілевіцкім, Холміцкім і Даямідаўскім сельсаветах ёсьць агрономы, але і тут нічога ня зроблена. 11 агрономаў раёну як сьлед не скарыстаны. Яны яшчэ 14 лістапада ў адкрытым лісьце, зьмешчаным у «Зьвязьдзе», абвясьцілі працытаць у калгасах ня менш, чым па 20 лекцый і кіраваць вожыму 3-я гурткамі.

Райза, райкалгассаюз і МТС патрабаваньні агрономаў перавесьці іх з канцылярый на практычную жывую работу па базыцьбе за ўраджайнасьць абыйшлі маўчаньнем. Роля агрэсэцыялістаў у гэтай справе не павышана.

Калгаснікі калгасу **«Савецкая Беларусь»** кажуць: «Ураджай у нас нізкі таму, што мы не ўладаем агратэхнікай. Нас трэба вучыць». Кіраўнікі-ж райза, РКС і МТС на выкананьне адной з важнейшых задач гледзяць скрозь пальцы.

«Не распрацавалі», «ня ведаем», «марудзем» — гэта самая характэрная рыса абломаўскіх тэмпаў работы рэчыцкіх раённых земельна - калгасных арганізацый. **Тамілаў, Равёнак і К° БЕЗАДКАЗНА** адносяцца да важнейшай дырэктывы партыі аб павышэньні ўраджайнасьці.

Рэчыцкаму райкому КП(б)Б трэба асабліва ўлічыць урокі весьнавой і асеньняй пасеўкампаній 1932 г. і неадкладна намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па забясьпячэньні больш высокага ўраджаю спэцыялістычных палёў.

Першыя крокі

ЖЛОБІН. (Белта). У раёне распачата работа на рэалізацыі пастановы ЦВК і СНК аб павышэньні ўраджайнасьці сельскай гаспадаркі.

Пры рэдакцыі «Шлях камунізму» адбылася нарада агрэспэцыялістаў. Райгазэта пачынае выдаваць агразэстаронку. Пры райза створан агрэсавет.

Абвешчан раённы конкурс, які ставіць сваёй задачай дабіцца паляпшэньня работы саўгасаў і калгасаў у напрамку павышэньня ўраджайнасьці, арганізацыі агразэтэхвучобы, своячасовай падрыхтоўкі да весьнавой сяўбы 1933 году.

У конкурс уключыліся партыйнікі, спэцыялісты і ўсе рабочыя МТС. Калектыў МТС абавязаўся закончыць у вызначаны тэрмін рамонт трактараў і падрыхтаваць за зімовы час ня менш 60 кваліфікаваных трактарыстаў.

Буйнейшы ў раёне калгас «Чырвоная Рудня» уключыўся ў конкурс і абавязаўся ўвесьці ў гаспадарцы дзесяцільны севазварот. У гэтым калгасе ў кожнай вытворчай брыгадзе арганізуюцца гурткі па вывучэньні агратэхнікі, у жывёлагадоўчых брыгадах — гурткі зоатэхнікі. Правяленьне ўжо забясьпечыла гурткі літаратурай і часопісамі. Вылучан адказны за агратэхвучобу член праўленьня.

Калектыў настаўнікаў ШКМ узяў на сябе абавязак кіраваць гурткамі.

Двойчы апрацаваныя палі

Турэўскі прымежны раён БССР раскінуўся сярод балот і лясоў Палесься. Яшчэ нядаўна ў гэтым раёне панавалі «дзедаўскія», старыя мэтады гаспадараньня. У 1927-29 годзе тут пракацілася прышчэпаўшчына, якая дала сазе адмоўныя вынікі.

У апошнія гады і асабліва ў бягучым годзе становішча рэзка зьмянілася. Замест прышчэпаўскіх хутароў растуць буйныя калектыўныя гаспадаркі. У калгасах аб'яднана 1.620 сялянскіх двароў з плошчай 4 269 гектараў.

Весьнавую пасеўную кампанію раён закончыў другім па БССР. Да 5-га кастрычніка закончана сяўба азімых.

Непасрэдная практыка перадавых калгасаў паказала, якую вялізарную карысьць дае зяблева. **Букшанскі** калгас (гэтага ж сельсавету) сеяў ячмень на полі, якое было зяблена і на полі незазябленым.

Што-ж атрымалася?

Зазябленае поле дало па 14 цэнтн. ячменю з гэктара, а незазябленае — па 9,6 цэнтн. Дварэцкі калгас, Запясоцкага сельсавету зьняў ураджай адпаведна: па 16,6 цэнтн. і 10,3 цэнтн. з гэктара.

Зяблева заплаціла Букшанскаму калгасу па 4,4 цэнтн. на гэктар і Дварэцкаму на 6,6 цэнтн.

Практыка павышэньня ўраджайнасьці перадовых калгасаў не прайшла даромна. Партрэдакцыя Турэўшчыны ацаніла гэту справу і паставіла перад сабой канкрэтную задачу: «Зазяблець усю плошчу пад травы клін 1933 г.».

На порадавую лінію былі накіравана «лёгкая артылерыя». 9 трактараў МТС у злучэньні з конскай цягай пазялілі 2 тыс. га — 105 проц. плану. 5.932 га ўзарана на ўсім раёне. Плян НКЗБ перавыкаран на 18 проц. Шмат калгасаў раёну **апрацавалі свае палі па два разы.** Першы раз—плыткае верыва, так званае лучэньне, за другім разам пакладзен глей і правялася глыбокае верыва.

Турэўшчына забясьпечыла на будучы год павышэньне ўраджайнасьці, а гэтым самым і далейшае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Гаворачы аб посьпехах раёну нельга абыйсьці пытаньня спэцыялізацыі Турэўшчыны. НКЗБ наўважліва падышоў да гэтай справы, надаўшы раёну жывёлагадоўча-кармавы напрамак.

Вопыт многіх гадоў паказвае, што ня гледзячы на старанную апрацоўку глебы і закладку ўгнаеньня, канопле растуць тут вельмі дрэнна. Выхад пяніці і па колькасьці і па якасьці мізэрны. Замест звычайных 6—7 цэнтн. атрымліваецца ў сярэдніх ня больш 2,5 цэнтн. з гэктара.

На думцы агрономаў, гэта залежыць ад якасьці глебы. Тут глеба суглінісная з вялікай прымесьсю ілістых частак. З гэтай прычыны яна не прапускае да корэньняў каналель патрэбнага паветра. Да такіх высноваў прыйшла і аб'яднаная экспэдыцыя беларускай і украінскай акадэмій навук.

Лён-жа тут расьце вельмі юбра. НКЗБ трэба перагледзіць спэцыялізацыю Турэўшчыны раёну і надаць яму **жывёлагадоўчальняны ўхіл.**

І. Бэн.

1.365 тон угнаеньня—пад адкосамі

Ад станцыі **Негарэлае** да станцый **Клімавічы** і **Цёмнага лесу,** ад **Бігосава** да **Пцічы** ляжыць 1.365 тон штучных угнаеньняў, нескарыстаных у весьнавую і асеньнюю пасеўкампаніі, ляжаць пад адкосамі на чыгуначных станцыях. З іх 358 тон растварымага фосфару, 971 тона фасфарытнай мукі і 306 тон сельвініту.

Саўгас **«Бігосава»** аказаўся манапалістам на сальвініт. Усе 36 тон яго. Па ўдзельнай вазе залежаў угнаеньняў рэкорд пабіў саўгас імя **Ламге.** 216 тон угнаеньня адрасаваных гэтаму саўгасу ляжыць на станцыі Добрушы ад весьнавой пасеўнай кампаніі.

Сотні цэнтнараў збожжа, бульбы, ільну не атрымалі мы па віне талавашчыкаў з **Аршанскай, Крупскай, Шклоўскай, Менскай** МТС, саўгасаў **«Даўгалесьсе», «Новы шлях», «Уваравічы», «Камонка»,** імя **Калініна** і раду іншых. Усе яны маюць сваю долю ў ліку 1365 тон.

Неабходна захаваць угнаеньне да наступнай пасеўнай кампаніі. Проба прымусіць кіраўнікоў саўгасаў і МТС **вывезьці гэта ўгнаеньне і захаваць** у памяшканьнях да вясны.

Х.

Выраб тавараў шырспажыву на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце па-за ўвагай заводзкіх арганізацый

А дах перакрыць забыліся...

Выраб тавараў шырспажыву па **Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце** расьцвітае ў чэрвені. Фармальна на камбінаце ідзе два цэхі, а плян па шырспажыву ня выконваецца. Асабліва дрэнна працуе цэхі, які арганізована пры асноўным лесапуху Камбінату. Ня гледзячы на моцную сыравую базу (адходы лесапуху) праграма 3 кварталу выканана толькі на палову. Кастрычнік і дзьве дэкады лістапада не далі патрэбнага эфэкту.

Адставаньне цэхі тлумачыцца недахватам рабочай сілы, дрэнай арганізацыяй працы і працэсу вытворчасьці. У ліпе ні цэх працаваў у тры зьмены, а пачынаючы з жніўня перайшоў на дзьве.

Ня 4 квартал цэхі зусім ня мае пляну. Загадчык **т. Вальфсон** нават ня ведае, ад каго ён павінен атрымаць плянавае заданьне—ці ад вытворчага аддзелу камбінату, ці ад плянавага аддзелу лесапуху.

Да 1 лістапада цэх выгабляў выключна тару. Зараз ён ператворан у адхіленьне асноўнага лесапуху і пачаў выпрабляць пра дукцыю галоўным чынам на экспарт. Выраб жа тавараў на шырокі ўнутраны рынак фактычна спынен. У выніку каштоўныя адкіды лесапуху па-ранейшаму гінуць.

Другі цэхі ісьцы пры асноўным дрэваапрацоўчым цэху камбінату. Ён выробляе розныя сталы, шафы, софы, табурэткі і інш. тавары шырспажыву. Гэты цэхі, як і першы, заданьне трэцяга кварталу таксама поўнасьцю ня выканаў. Кастрычнік—лістапад, хаця і далі некаторае павышэньне тэмпаў работы у параўнаньні з трэцім кварталам, але ўсё-ж такі плян недавыконвае.

Доўгі час цэхі ня меў уласнага памяшканьня. Адміністрацыя камбінату, замест цвёрдай работы ўвесь час займалася пустымі разважаньнямі аб пабудове памяшканьня. А калі паступілі халады, адміністрацыя насьлях зьмясьціла цэхі пад навесь камбінату. Прыставіўшы да навесі сьцены, зусім выпусьцілі з пад увагі яе перакрыць. Як толькі пачаліся дажджы, уся праца цэху павісла была спынена. Увесь матэрыял і гатовыя вырабы ад вільгаці папсаваліся. Зараз памяшканьне прыведзена ў парадак але ў ім вельмі цесна, што перашкаджае нармальнай рабоце цэху. Адчуваецца тэстрая патрэба ў асобным памяшканьні для паліроўкі і афарбоўкі рэчаў, якія выробляюцца цэхам.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што выраб тавараў шырспажыву на Бабруйскім камбінаце ня стаў яшчэ ў цэнтры ўвагі заводзкіх арганізацый. Такое становішча далей непярпіма.

Федасцеў.

Вынік слабай перабудовы

Нядаўна ў Віцебску адбыліся міжраённыя зьезды ўдарнікаў прамысловых арцеляй. Як-жа віцебскія міжраённыя прамсаюзы ажыцьцяўляюць задачы, якія зараз стаяць перад прамкалярацыяй? З якімі паказальнікамі яны прышлі да сваіх зьездаў? Лічбы выканаўчых прамфінпляну самі за ся бе гавораць. Скурабутковы прамсаюз, які аб'ядноае 46 арцеляй дзевяцімесячны плян выканаў усяго на 74 проц., а кастрычніцкі толькі на 59,9 проц.

Буйнейшая арцель «Каапрамонт», якая налічвае 300 членаў, кастрычніцкае заданьне—адрамантаваць абутку на 330 тыс. руб.—выканала толькі на палову. Старшыня арцелі **Фалкоў,** замест апэрацыйнага кіраўніцтва работай арцелі займаецца голым абмеркаваньнем. Ён зусім ня лічыцца з думкамі і заўвагамі арцельшчыка, а дзейнічае па-дыктатарску. Прывезьлі адзін раз у арцель хром і сьвіныя скуры. Трэба было рабіць дзіцячы абутак і буцы на драўлянай падэшве. І вось наводле трохнага загаду Фалкова хром быў скарыстан на буцы, а сьвіныя скуры на дзіцячы абутак. Заўвагі членаў арцелі, што так рабіць нельга, што хром лепш скарыстаць на дзіцячы абутак—засталіся без усякай увагі. Можна сабе ўявіць, які атрымаўся абутак для дзіцей з сьвіных скур.

У **Сураскай і Дрыжынскай** абутковых арцелях прамфінплян таксама выканан ня больш як на палову. Старшыня Сураскай арцелі тав. **Глезэраў,** замест баявой работы па мабілізацыі арцельшчыкаў на выкананьне прамфінпляну самавольна зьяжае вытворчыя заданьні. Такія-ж факты назіраюцца і **ў Дрыжынскай** абутковай арцелі.

Кожнай арцелі пастановай ураду дана права «бесьперашкодна паўсюдна загатоўкі для патрэб сваёй вытворчасьці неабходнага сыраду за выключэньнем бавоўны, лянькі, воўны і скуры, апрача сьвіных скур, загатоўка якіх дазваляецца». Як-жа арцелі рэгістрацыі загатоўкі сьвіных скур? Дрэнна і вельмі дрэнна. Пры заданьні загатовіць 12 тыс. скур у IV квартале да 20 лістапада загатоўлена толькі 435 скур або 3,5 проц. У арцелях яшчэ не разумеюць, што ад выкананьня пляну загатоўкі скур залежыць іх далейшае снабжэньне сырцом. 6 арцеляй на рамонту абутку ў калгасах, зусім не распачалі загатоўкі скур у той час, калі ёсьць вялікія магчымасьці загатаўляць скуры ў калгасах.

На лепшае становішча і з загатоўкай—пакупкай розных скураных адыходаў. Больш паловы арцеляй да гэтага часу яшчэ не заключылі дагавары з прадпрыемствамі на атрыманьне адыходаў.

Не перабудавалі як сьлед сваёй работы і арцелі шэйна-трыкатажнага прамсаюзу. Уже два месяцы прайшло, як пачалася рэарганізацыя. Між тым ліквідацыя затрымлівае тропы арцеляй, што значна тармозіць зваротныя эпэрацыі. Так арцель **«Канэтчык»** ня мае магчымасьці загатаўляць сырэц, бо няма грошай, у той час, як прамсаюз вінаваты ёй 104 тыс. руб. У Віцебску ў трыкатажнай арцелі **«Чырвоны кастрычнік»** ёсьць вялікія залежкі незакончаных пашыхаў (паўфабрыкатаў) на 14 тыс. руб., у Гарадоцкай арцелі—на 6 тыс. руб. Ня гледзячы на тое, што лянчохі ляжаць доўгі час, прамсаюз не зварачае на гэта ўвагі.

У арцелях не хапае шэйных іголак і нітак, машыны патрабуюць рамонту. Задача прамсаюзу—дапамагчы ў гэтай справе арцелям. Аднак ён і ня думае дапамагаць. Старшыня **Кубліцкай краязцкай** арцелі тав. **Іофін** у сваім выступленьні на зьезьдзе заявіў так:

— **У мяне перабой у рабоце з-за адсутнасьці нітак. Мы знаходзімся ад блізкейшай станцыі на адлегласьці 50 клм. Кожная паездка ў Віцебск каштуе больш 100 руб. А калі прыяжджаеш у свой прамсаюз, то са складу адпускаюць нітак ня больш як на 5 дзён. Вось і працуй.**

Пры арцелях ёсьць 7 ларкоў, праз якія яны рэалізуюць сваю продукцыю на калгасных рынках. Які іх зварот, і як яны гандлююць—трыкатажна-шэйнаму прамсаюзу не вядома. Гэта яшчэ раз ярка сьведчыць аб адсутнасьці канкрэтнага кіраўніцтва і інструктажу.

Такое становішча прыводзіць да значнага недавыкананьня прамфінпляну. За кастрычнік, напрыклад, праграма выканана ўсяго толькі на 88 проц.

Выключэньнем з усіх арцеляй шэйна - трыкатажнага прамсаюзу зьяўляецца Янавіцкая (Стражкі раён) арцель **«Кравецкая праца».** За 9 месяцаў яна дала 126,6 проц. пляну, а кастрычніцкую праграму выканала на 146 проц. Посьпехі арцелі тлумачацца тым, што не калектыў значна павысіў працоўную дысцыпліну, разгарнуў сацыялістычныя формы працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Прамфінплян даведзен да кожнага варштату і рабочага. Праўленьне арцелі ўпершыню мінулым годзе пачало ствараць уласную харчовую базу. Правядзіцца самазагатоўкі прадуктаў. Арганізован уласны агарод, які ў гэтым годзе даў арцелі вялікую колькасьць пладагародніны для паляпшэньня грамадзкага харчаваньня.

Вялікую работу праводзіць арцель у сэнсе загатоўкі сыраду. Ёсьць загатоўчы пункт. На вёску пасылаюцца карабейнікі. Арцель прымае індывідуальныя заказы з матэрыялу саміх заказчыкаў. Вспыт работы гэтай арцелі трэба неадкладна перанесьці ў іншыя арцелі трыкатажна-шэйнага прамсаюзу.

Р. Вярхоўсні.

Шматтыражкі на закутках

(Ліст з Віцебску)

Так кіраваць і дапамагаць заводзкім шматтыражкам, як гэта робіць рад віцебскіх партколектываў і гаркам КП(б)Б, нельга. Для таго, каб уявіць сабе, як партыйныя органы Віцебску адносяцца да фабрычна-заводзкага друку, даволі прывесьці некалькі фактаў.

На заводзе «Прафінтэрн» ужо два месяцы таму назад зьнят з працы рэдактар шматтыражкі «Прафінтэрнавец». Ні культпроп гаркому, ні партколектыў заводу да гэтага часу ня вылучылі рэдактара і шматтыражка выпускаецца пад кіраўніцтвам... тэхнічнага работніка рэдкалегіі. Ніякай работы з рабкорамі не праводзіцца, матэрыялы, якія зьмя шчаюцца ў газэце, надзвычай ніякай якасьці.

Ня лепш і на абутковай фабрыцы імя Лекерта. Там бюро партколектыву вылучыла на працу адказнага рэдактара шматтыражкі тав. Вертліна, які на сваім разьвіцьці і шкодлівасьці (ён малапісьменны) не адпавядае свайму прызначэньню. Калі члены рэдкалегіі раілі тав. Вертліну арганізаваць паказ работы лепшых гаспадарча-разрахунковых брыгад, выкрыць адстаючых, ён адмовіўся зрабіць гэта, матывуючы тым, што... «нельга ісьваць адносін з рабочымі». Да рэчы, аб гэтым ведае сакратар партколектыву, але захаваў ніякіх ня ўжывае.

На заводзе «Чырвоны мэталіст» доўгі час у якасьці рэдактара працаваў тав. Пімштэйн, які добра ведаў даручаную яму справу, карыстаўся аўтарытэтам сярод рабочых, значна палепшыў працу шматтыражкі. Ня гледзячы на гэта, бюро партколектыву, у прыватнасьці сакратар тав. Рабкін, палічыла, што няважна, хто будзе кіраваць шматтыражкай, і перакінула г. Пімштэйна на другую работу. Шматтыражка ў разультаце такіх мерапрыемстваў партколектыву значна пагоршыла сваю работу.

Аналягічнае становішча мае месца на фабрыцы імя КІМ'у.

Бюро партколектыву шчотачна-шчаціннага камбінату амаль праз кожны месяц мяняе рэдактара шматтыражкі. Газэта на гэтым прадпрыемстве выходзіць са значнымі перабоямі.

Пакуль гарком КП(б)Б ня зьверне па ўсё гэта належнай увагі, пакуль кіруючыя партыйныя работнікі на прадпрыемствах не зразумеюць, што работа газэты ёсьць адзін з важнейшых участкаў партыйнай работы, — датуль належных вынікаў віцебскія шматтыражкі не дадуць.

Фляўменбаўм.

Законны рахунак Эльводу

(Ліст студэнтаў)

Здаецца ўсім вядома, якое значэньне мае вячэрняе навучаньне. Тысячы працоўных, не адрываючыся ад вытворчасьці, наведваюць вячэрнія школы, імкнуцца павысіць свае веды.

Возьмем наш менскі унівэрсытэт. Тут што дзённа вечарамі зьбіраецца вялікая колькасьць студэнтаў, жадаючы праслухоць лекцыі, пачарпнуць ведаў.

Урад ідзе насустрач працоўным і ўсялякімі захадамі дапамагае вячэрняму навучаньню, трацячы на гэту справу вялікія сродкі.

І вось нечаканая акалічнасьць, «дробязь», якая адным махам зрывае карысную справу, гэта сьвятло.

Студэнты сабраліся. Аўдыторыі перапоўнены. Лекцыя пачынаецца. Не пасьпеў лектар раскрыць рот, як раптам... хліп, сьвятло гасьне і ўвесь унівэрсытэцкі гарадок тоне ў цемры. Праз хвіліну паведамляюць:

— **Сьвятла ня будзе, можна ісьці дамоў.**

Вось тут табе і лекцыі, і веды і ўсё разам.

Гэта не адзінкавы выпадак. На працягу аднэй шасьцідзённай з-за адсутнасьці сьвятла поўнасьцю зрываюцца заняткі ня менш двух разоў. Падрываюцца-ж кожны дзень на гадзіну-дзьве.

Адчуваецца пойкае простае ігнараваньне унівэрсытэцкага гарадка. Наўколо на ўсім квартале сьвятло гарыць, а тут «хоць вочы выкалі».

Для таго, каб вячэрняя вучоба была эфэктыўнай, каб сродкі, якія затрачваюцца дзяржавай, пайшлі на карысьць, трэба дабіцца, каб **Эльвод бесьперабойна забясьпечваў унівэрсытэцкі гарадок сьвятлом.**

Пацічоўскі, Паляшук, Аршанскі.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» чакае ад менскага эльводу тэрміновых захадаў па бесьперабойным забесьпячэньні унівэрсытэцкага гарадка сьвятлом.

РАБСЕЛЬКОРЫ ПІШУЦЬ, ШТО:

Да кастрычніка 1932 году ўсе самаўкоўныя работнікі абслугоўваліся сталоўкай, што знаходзіцца па Камуністычнай вуліцы. Цяпер гэта сталоўка выкарыстана толькі для абслугоўваньня Дому вучоных. Такім чынам ужо з кастрычніка месяца рад самаўкоўных работнікаў ня маюць сталоўкі. Гарбкор сацыяльнаўкоўных работнікаў ня прымае захадаў, каб забясьпечыць апошніх пастаўленым месцам харчаваньня. **Косіна.**

Работа друкарні «Рэчыцкай праўды» замаруджала дрэнна. Газэта штодзённа выходзіць замест 6 гадз. раніцы — у 8-9 гадзін. І гэта ў той час, як выхад лістаносцаў па кантрольных тэрмінах прызначан ня 9 гадз., а апэраўка ім даўся — ва 7 гадз. У выніку — мясцовая газэта надыходзілася спазьнацца, шмыгнуць назад, чым цэнтральны друк. **Ляпіч.**

15 мая 1932 году зрэшчкі леарабкоп атрэвіў шахцы ім у Маглеўскі заводу «Серп» 10 бочак алею для патрэб лерабочых. Маглеўская прыстань выдала заводу толькі 6 бочак. У гэтым-жа завод быў пасланы тры жалезныя бочкі, якія завод зусім не атрымаў. Аб недахопах пераходзкай прыстані было напісана маглеўскаму пракурору, але вынікаў даготуль ніякіх няма. **Хэйфец.**

Яшчэ 17 кастрычніка зазуковыя сялоны калгаснага ёстэтуту былі пераведзены на пошту Ленны ў сумме 396 руб. на імя Сьпірыдонава М. Ф. у г. Гомель. У выніку дрэнная работы мясцовай пошты тав. Сьпірыдонаў яшчэ не атрымаў грошай да гэтага часу. **Дарашэвіч.**

Мною ў сьнежні месяцы 1932 году была здана падпіска на творы Леніна ў адрэс Оносдуку (г. Ворша). Не атрымаўшы даўно час кніжак, я зьвярнуўся за даведкай да загадчыка аддзелу Малосіча. Апошні выказу аумар, заяваз і абяцаў паведамліць.

Позз некаторы час атрымліваю паведамленьне такога зьместу: «Мосеці ДВВ паведамляе, што калі падпісчык зусім не атрымаў кніжак, пачынаючы адкрытых лістом і усе падпісаныя тамы будуць выдаены».

Аднак карыстці ад гэтым паведамленьнем мала: выпісаных кніжак сёмма да гэтага часу, а т. Малевіч, не жадаючы як сьлед выканаць свой абавязак, прапанаваў мне... забраць, здаецца на падпіску тропы сакад. **Шаўцоў.**

На Якаўлевіцкай сукэтнай фабрыцы, Аршанскага раёну, налічваецца каля 100 ударнікаў, якія штодзённа перавыконваюць свае нормы выпрацоўкі. Але вялікімі прыдзіркамі яны не карыстаюцца. Мы-та раз пісалі аб гэтым у насьцяннаеце фабрыкі, але фабрычныя арганізацыі, дырэкцыя, партколектыў і фабком не зварачаюць належнай увагі.

Мянсэвіч С. М.

Па сьлядох рабселькораўскіх лістоў

„Злачынца Міглякоў і К° заслугоўваюць суровага пакараньня“

Клімавіцкая раённая пракуратура паведамляе, што факты, паданыя ў допісе «Злачынца Міглякоў і К°»... («Зьвязда» ад 11 кастрычніка) яўляюцца шаньвердзіліся. Справа Мігликова, Сальмянка і інш. перадана на разгляд вярхоўнага суда БССР.

„Чаму зрываецца будаўніцтва Астровенскага ільназаводу?“

Пасьля расьсьледаваньня допісу «Чаму зрываецца будаўніцтва Астровенскага ільназаводу» прэзыдыум Бешэнковіцкага райКК-РСІ пастанавіў:

«... Факты, паказаныя ў допісе, характарызуюць сапраўднае становішча будаўніцтва. ... За адсутнасьць апэрацыйнага кіраўніцтва пабудовай, за прыміраючыя адносіны да шкодных работы дзеячыка, вагульны абыякавы да рабочых, за своячасовыя сьпіталы аб прарывах на будаўніцтве, і непрыняцьце рашучых мер да ліквідацыі прарыву, што давяло будаўніцтва да зрыву, т. Лейчанка (загадчык будаўніцтва) заслугоўвае суровага спакараньня. Аднак, улічваючы тое, што тав. Лейчанка зьяўляецца рабочым-выдвіжэнцам і перапы раз працуе на кіруючай рабоце, ня маючы выстарчальнай адукацыі і кіраўніцтва, і крымаючы пад увагу тое, што ён у апошні час забясьпечыў значны пералом у выкананьні пляну будаўніцтва, — палярэдзіць тав. Лейчанка, што калі да 1-га сьнежня 1932 г. ня будзе своячасна пабудаваны заводу, кантрольная камісія будзе пастаўлена пытаньне аб прыцягненьні яго да адказнасьці».

„Сабе і жонцы“...

Палярэдняе расьсьледаваньне, праведзенае Ірунскім райкомам партыі па допісу «Сабе і жонцы», зьмешчаным у «Зьвязьдзе», устанавіла, што падданы ў ім факты адпавядаюць сапраўднасьці. РК КП(б)Б вынес пастанову аб зьняцьці з работы сакратара Нацкай партыйнай ячэйкі Данілава.

Пытаньне аб знаходжаньні Данілава ў партыі будзе разгледжана пасьля канчаткавага абследаваньня работы Нацкай партыйнай ячэйкі.

СЛОВА ЗА ПРАКУРАТУРАЙ

Радзівуся Крамянскі. Разам са сваім загатчыкам радзаваіся сьвінарні, бачачы дружны рост стада.

Багата рэзультатамі была іх работа. За кароткі час ад невялічкай кучкі сьвінматкам узгадавана здаровае, вялікае стада прыгожых «бэкшыраў», матысаў, палянцаў. Стала па фэрме 62 сьвінаматкі, 84 гадзьвінкі, 4 кныры, 5 кабанаў, 193 шт. парасят.

Заўчасна цешыліся ўдарнікі. Плод іх работы не пашоў туды, куды яны меркавалі. Гонар і радасьць сьвінароў страцілі жулікі, шкуднікі, нагулі злачынцы з кулацкага лягеру. Не падумайце толькі, што яны блужаюць дзе-небудзь. Не. Яны садзяць на пэўных, цёплых мясцох у Тураве. Іх асноўная рэзыдэнцыя — кантора тураўскай МТС. Адгэтуль і пачалося.

Крыху назад.

Калгасу **імя Вароўскага,** якому судзьба знаходзіцца на тэрыторыі **Тураўскага раёну,** не пад сілу стала ўзрошчая сьвінафэрма: мала зямлі — мала корму. Выходзячы з добрых намераў, калгаснікі парашылі:

— Фэрму разбуйніць. Лішак сьвіней прадаць для камплектаваньня нова-арганізаваных СТКФ.

На жаль, гэта засталося толькі меркаваньнем. Папяток дарогі стала камячка сьцяна ў асобе цьвёрдалобых чыноўнікаў з Тураўскай МТС. Чыноўнікі засумавалі па парсючкох і вельмі ахвотна дагаварыліся па-шкурніцку скарыстаць разбуйнічыя сьві нафэрмы калгасу імя Вароўскага.

Зрабіць гэта было ня цяжка, бо калгас падпачаляе МТС і тут, можна сказаць, «свая рука ўладыкі».

Энтэзэаўцы палічылі злачынствам выпусьціць з рук такое шчасьце, як мець кабанчыка або і два. Ад аднэй думкі мутнее ў вачу, разгараецца воўчы апэтыт. І вось зграя кідаецца рваць.

«Важаком» становіцца «стары воўк» — **дырэктар МТС Фінкельштэйн.** Ён хапае самы буйны кусок — «купляе» двух гадавалых парсючкоў. Следам за дырэктарам уключаюцца:

Агранам МТС Ярмачэнка.

Сакратар МТС Кіб.

— А я-ж што? Няўжо ў дурнях заставацца? — падумаў старшыня райкалгассаюзу **Скалазуб** і пасьпешна, разам са сваім сакратаром **Гілецам,** выяжджае ў калгас імя Вароўскага.

Пратэнтана сьцежка. На ёй аўтарытэтныя сьлады начальства з МТС і РКС. Гэтаю сьцежкай, сабраўшы крысы ў рукі, пайміраліся ў калгас імя Вароўскага:

Дырэктар тураўскага камбінату Барысавіч.

Тэхнік будаўнік Курбан.

Сарамаха, Казлоў.

Дзень пры дні паяжджалі ў калгас дырэктары, сакратары і інш. з гэтага раёну. Заехаўшы ў калгас пачынаецца гутарка, якая абавязкова канчаецца дакладным запытаньнем:

— Ці ня можна ў вас нарэзя якое купіць?

Старшыня калгасу адчуваў рост сваёй асабістай вартасьці. Яго ценнуў выгляд лісьлівага начальства. Старшыня самаўлюбёна пацішеваў квітэі на водпіс «парасят», ведаючы, што:

— Раз гэта для адказных пашаўнікоў, яму адказваць ня прыдзецца.

«Ліха бяды пачатак», кажа пагаворка. Далёка пабеглі чуткі аб «добрым» калгасе. Пацягнуліся купцы з Жыткавіч, Крычава, шчынай.

Рэзультат чакаць сябе ня прымусіў. З агульнага ліку сьвіней на фэрме засталіся 62 : 30 маладых сьвінаматак, 13 штук маладняка, 2 кныры і 17 парасят, 136 сьві ней разбазарана. Сьвінаматкі, кныры, племянны маладняк бязьлітасна зьнішчаны.

Фэрма далёка ня выканала пляну загатовак і пастаўлена перад фактам немагчымасьці выканаць свае абавязкі перад дзяржавай. Ёй няма чаго здаваць. Не так паставілі Фінкельштэйны, Скалазубы, праўленцы калгасу — кулацкія агенты пад маскай калгаснікаў і спэцыяльных работнікаў.

П. Чыкун.

ПРАЦЭС ТАРАШКЕВІЧА

Першы дзень суда

ВІЛЬНЯ, 29. — Як паведамляе віленская прэса, **28 лістапада ў 9 гадзін 30 мінут раніцы ў Віленскім акруговым судзе пачаўся працэс тав. Тарашкевіча.** Гэта ўжо пяты працэс. Як вядома, апрача Тарашкевіча на лаве падсудных заседі яшчэ **Пётра Бакач — 24 год, Аляксандр Лябецкі—23 год, Барыс Махляр—21 год, Уладзімер Лебка—17 год і Міхась Рэшатаў—20 год.**

Будынак суда акружан моцна ўзброенымі атрадамі паліцыі. Паліцыя ўведзена і ў будынак суда.

Яшчэ задоўга да пачатку працэсу кулюары суда шчыльна запаўняюцца публікай. Ад пак у залю публіка дапускаецца толькі **па спэцыяльных білетах.** Перад пачаткам суда ў кулюарах сабралася так многа публікі, што, каб ачысьціць іх, быў выкліканы спэцыяльны атрад паліцыі.

Пасьля зачытаньня акту абвінавачаньня даецца слова падсудным. Першым пачынае гаварыць **тав. Тарашкевіч.** У пачатку сваёй прамовы тав. Тарашкевіч пратэстуе супроць суда над ім. Прамова Тарашкевіча працявалася **звыш 3-х гадзін.** Тарашкевіч гаварыў па беларуску. Прамова яго як прыгадае Нават Манархічнае віленскае «Слово», выслухоўваецца публічнасьцю залі з вялікай запікаўленасьцю.

У прамове тав. Тарашкевіч зачуляе, што ён зьяўляецца прыхільнікам сучаснага капіталістычнага ладу і імкнецца да яго зьмены. Міжнародны капітал—па думцы Тарашкевіча—перажывае крызіс, разлагаецца і зьяўляецца перашкодаю на шляху да прагрэсу чалавецтва, на шляху да вызваленьня падпяволеных народаў.

З турмы ён быў вызвалены датэрмінова на пераговор яго волі, бо лічыў патрэбным адбываць рэшту кары разам з іншымі членамі разгромленай Грамады.

У пачатку выбарчай кампаніі жыў пе вёсны, на Віленшчыне, дзе займаўся перакладам на беларускую мову «Лілцы» Гомэра, а потым, калі выбарчы сьпіс быў забаронены, і калі за ім пачала сачыць паліцыя, выехаў у Данцыг, а потым у Бэрлін. Там ён дзейнічае сярод эміграцыі, дае інтэрв'ю і, нарэшце, бярэ ўдзел у міжнародным сялянскім кангрэсе.

У Савецкай Расіі ніколі ня быў.

Што датычыць іншых абвінавачаных, то Тарашкевіч першы раз іх бачыць.

Як зазначае польская прэса, адным з кульмінацыйных пунктаў у працэсе былі высьвятленьні Тарашкевіча аб яго адносінах да кампартыі. Тарашкевіч заявіў, што да ўжо таго, што адбываецца ў БССР, ён адносіцца станоўча, бо верыць у шчырыя адносіны бальшавікоў да беларускага пытаньня. Ён не зьяўляецца нацыяналістам і не падзяляе пытаньня нацыянальнага ад сацыяльнага. Ён зьяўляецца марксыстам і лічыць, што бальшавікі закладаюць фундамант будучай культуры чалавецтва. Як кажны сацыяліст, сваім ідэялам ён лічыць камуністычны лад.

Адказаючы ў сваёй прамове Тарашкевіч падкрэсьлівае, што ня верыць у вырашэньне беларускага нацыянальнага пытаньня Польшчай у рамках польскай канстытуцыі, бо спасыланьне на канстытуцыю ёсьць ні больш ні менш, як «ігра на разьбітым інструмэнце з парванымі струнамі».

Ён таксама ня верыць у вырашэньне беларускага пытаньня ў Польшчы шляхам узброенага паўстаньня. Тарашкевіч лічыць, што гэта пытаньне можна вырашыць толькі шляхам зьмены ўсяго існуючага ладу, шляхам стварэньня ў Польшчы рабоча-сялянскага ўраду. Тады справа незалежнасьці Беларусі вырашыцца сама сабой.

Сьведкаю з боку ўраду на працэсе выступаў вядомы нацыянал-фашыст Астроўскі, які, баючыся зьдмаскаваць сябе перад беларускімі працоўнымі масамі, у сваіх паказаньнях маніўраваў, каб скрыць сваё сапраўднае контр-рэвалюцыйнае аблічча.

Адказваючы на ўказаньні нацыянал-фашыста Астроўскага, Тарашкевіч паясьняе, што зьяўляецца прыхільнікам калектывізацыі і рэзка кляйміць тых беларускіх дзеячоў (падпомаў), якія выступаюць супроць калектывізацыі ў СССР.

Тарашкевіч заяўляе, што ён зьяўляецца працілікам прымусовай калектывізацыі і стаіць за добраахвотную калектывізацыю і што іменна такая калектывізацыя адбываецца ў Савецкім саюзе.

Допыт іншых падсудных яшчэ раз пацьвярджае фабрыкацыю справы Тарашкевіча і наогул усяго працэсу.

Нават «Дзеньнік віленскі» ад 29 лістапада, падаючы ход працэсу, даволі выразна ўказвае на фабрыкацыю яго. Газэта піша: **«Пасьля допыту, іншыя падсудныя стушаваліся зусім. Судовае сьледзьва паказала, што гэтыя асобы выпадкова трапілі на лаву падсудных разам з Тарашкевічам».**

Працэс цягнуўся да 2-х гадзін ночы.

ПРАТЭСТ РАДЫКАЛЬНАГА БЕЛАРУСКАГА І УКРАІНСКАГА СТУДЭНЦТВА У ЧЭХІІ І ЧЭСКІХ КУЛЬТУРНЫХ ПРАЦАЎНІКОУ

Супроць нацыянальнага ўціску ў Зах. Беларусі і Зах. Украіне

У сувязі з працэсам над тав. Тарашкевічам, у Празе (Чэха-Славакія) у апошніх лічбах лістапада адбыўся мітынг пратэсту беларускага і украінскага радыкальнага студэнцтва і рабочых. На мітынгу ўхвалена наступная рэзалюцыя:

«Польская ўлада ўтрымлівае сваё суровае панаваньне над 2,5 млн. беларусаў і 6 млн. украінцаў шляхам бязупыннага нацыянальнага і сацыяльнага ўціску.

Узмацняецца культурная рэакцыя, распускаецца «Грамада» і «Сельроб», праследуецца ТБШ і «Просьвіта», закрываюцца апошнія прыватныя гімназіі і народныя школы, ліквідуецца радыкальная прэса. Стойкія змагары супроць гэтых гвалтаў кідаюцца ў турмы, катуюцца, выганяюцца ў эміграцыю. Аднаго з такіх найлепшых барацьбітоў праф. Б. ТАРАШКЕВІЧА судзяць у Вільні. Яго судзяць за тое, што ён сумленна і непахісна змагаўся за культурна-нацыянальны і сацыяльна-вызваленчы рух, за элемэнтарныя правы людзей на культурнае жыцьцё.

Радыкальнае студэнцтва і рабочыя Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны востра пратэстуюць супроць такога бясправуя, супроць зьняволеньня прафэсара Б. Тарашкевіча і патрабуюць яго вызваленьня ў імя культуры, супроць барбарства.

Да пратэсту беларускага і украінскага радыкальнага студэнцтва далучылі свае подпісы і чэскія культурныя работнікі:

ПРАФЭСАР ЗДЭНСК НЕЕДЛЫ, Д—Р ФРАНТ. КРЭЙЧЫ, ПРАФ. Д—Р Ф. КС. ШАЛДА, ІНЖ. АРХ. ІЖЫ КРОХА, Д-Р БОГ, ВРБЭНСКІ, ВЛАД. ВАНЧУРА, АРХ. КРЭЙЦАР, МІЛЕНА КРАЙЦАРАВА, Д-Р ЯН ГАЛАС, ПРАФ. І. ШПАЛЕК, ФРАНТ. ГАЛАС, В. КАПЛІЦКІ, Д-Р ВЛАД. ПРОХАЦКА, РУДОЛЬФ ВЭЙРЫХ, Д-Р ІВАН СЕКАНІНА, МАРЫЯ ПУЙМАНАВА, КАРЭЛ ТАЙГЕ, Д-Р ГУГО НЭХТ, МАРЫЯ МАЭРАВА, ОСКАР БАУМ, ГАЛЕНА МАЛІРЖОВА, ІВАН ОЛЬБРАХТ, Д-Р ФР. БІЛЬ, Д-Р К. І. БЭНЭШ, ЗРВІНА БРАКЕШОВА, ОТТО ГІРГАЛЬ, ПРАФ. ЭРВІН ШУЛЬГОФ, ДР. БЭДРЖЫХ ВАЦЛАВЭК, ДР. ДУШАН МАКАВІЦКІ, В. ПЕКАРЭК, ДР. ВЛ. КЛЕМЭНТЫС, МАКС. ГЕЛЕР.

Хваля абурэньня на Зах. Беларусі

ВІЛЬНЯ. У сувязі з працэсам Тарашкевіча, як падае віленская прэса, па заклику КПЗБ па ўсёй Заходняй Беларусі адбыліся масоўкі і мітынгі, на якіх ухвалялися рэзалюцыі пратэсту, а таксама выбіраліся сялянскія дэлегацыі для пасылкі ў Вільню ў суд з пратэстамі. Ня гледзячы на тое, што некаторыя сялянскія дэлегацыі былі арыштаваны ў дарозе, а часткa — на месцы, усё-ж, як піша манархічнае «Слово», многія дэлегаты прыбылі ў Вільню.

У Вільні, ня гледзячы на мабілізацыю паліцыі і дафэнзывы, ва многіх частках горада рабочымі рабіліся спробы налажываць дэманстрацыі і мітынгі. Аднак усюды ішы раз гэнялся паліцыяй. Праведзен цэлы рад вобыскаў і арыштаў.

Бібліяграфія

Матар'ялы, якіх нельга было выдаваць

«Пастановы першай сэсіі Дзярж. Вуч. Савету БССР». Вучпэдсэктар ДВБ. Менск, 1932 г. Брашура ў 46 стар.

Дзяржаўны вучоны савет, як частка Наркамасьветы, мае права распрацоўваць і зацьвярджаць навучальныя пляны і праграмы для пачатковай, сярэдняй і вышэйшай школы, а таксама ўстанаўляць сыстэмы і мэтады навучаньня на ўсіх зьвеньнях народнай асьветы.

Таму пастановы першай сэсіі Дзярж. Вуч. Савету БССР ад 5-9 мая 1932 году маюць характар **кіруючага** матар'ялу. Старшыня Дзярж. Вуч. Савету т. Вальфсон падкрэсьлівае ў сваёй прамове да выданай брашуры, што паказаныя пастановы «ставяць перад Дзярж. Вучоным Саветам вельмі складаныя і адказныя задачы».

Але ўся бяда ў тым, што публікуемы матар'ял рэзка разыходзіцца з пастановай ЦК УсеКП(б) аб навучальных праграмах і рэжыме ў масавай школе і з пастановай ЦВК аб вышэйшай школе. Замест таго, каб эмацыпа за бальшавіцкую рэалізацыю дыяктыў партыі аб школьным будаўніцтве, Дзярж. Вуч. Савет, выдаючы пастановы першай сэсіі, **фактычна зрывае ажыцьцяўленьне гэтых дырэктыў.**

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб навучальных праграмах і рэжыме ў школе падкрэсьлівае, што «ні адзін мэтад ня можа быць прызнаны асноўным і універсальным мэтадам вучобы». Далей у дакуманце ЦК паказваецца той недахоп школы, што «ў школьнай практыцы атрымаў распаўсюджаньне, як асноўны так званы «лябараторна-брыгадны» мэтад, які суправаджаўся арганізацыяй сталых і абавязковых брыгад, прывёўшых да скажэньняў у выглядзе абязьлічкі ў навучальнай працы, да зьніжэньня ролі педагога і ігнараваньня ва многіх выпадках індывідуальнай вучобы кожнага вучня». Цэнтр. Вык. Камітэт СССР у пастанове ад 19 верасьня 1932 г. таксама прызнаў «нямэтазгодным ужываньне «брыгадна-лябараторнага» мэтаду ў яго сучаснай фактычна складзенай форме»... А што мы чытаем у пастановах першай сэсіі Дзярж. Вуч. Савету БССР? Тут у жасьці дасягненьняў у працы ДВС паказваецца на выданьне «інструкцыйна-мэтадычнага ліста аб лябараторна-брыгадным мэтадзе», які быццам «мабілізаваў студэнцкія і выкладчыцкія масы вакол актывізацыі подпрацэсу і садзейнічаў узьнаўленьню якасьці выкладаньня ў ВНУ і тэхнікумах на большую вышыню» (стар. 6).

ЦК партыі ўстанаўляе, што «асноўнай формай арганізацыі вучобнай працы ў пачатковай і сярэдняй школе павінен зьяўляцца ўрок з данай групай вучняў, са строга вызначаным раскладам заняткаў і цьвёрдым складам вучняў». А ўказаны інструкцыйна-мэтадычны ліст ДВС падкрэсьлівае, што «лябараторны мэтад арганізацыі вучобы пры адпаведным яго ўжываньні адпавядае ў большай ступені, чым клясна-лекцыйная форма заняткаў» (стар. 5). Адсюль відаць, што ДВС зусім выразна разглядае лябараторна-брыгадны мэтад, як найлепшы. «Пры лябараторным мэтадзе працы, як паказвае практыка (вопыт), павышаецца якасьць работы»,—піша ДВС у сваім інструкцыйна-мэтадычным лісьце.

Пастанова ЦК партыі і пастановы ЦВК выказваюцца **супроць** сталых і абавязковых брыгад. Інструкцыйна-мэтадычны ліст ДВС, наадварот, лічыць, што «для большасьці школьных прадметаў брыгадная работа мае станоўчае значэньне» (стар. 16). Далей мы чытаем: «Працягласьць існаваньня брыгады не павінна быць занадта кароткай,—ня менш аднаго кварталу, лепш—паўгодзьдзя, ні ў якім разе не дапусьціць перажамплектаваныя пасьлядоўнага заданьня» (стар. 17).

Такім чынам ДВС стаіць на пазыцыі абароны брыгады, як сталай і абавязковай арганізацыі вучняў. «Мы лічым,—кажа ДВС,—каб брыгада была ўстойлівай адзінкай, ня толькі для мэт тэарытычнай вучобы, але і для працоўных заданьняў па лініі вучобы, для грамадзкай работы ў сувязі з вучобай і т. п.» (стар. 18). Тут-жа ДВС адкрыта ставіць **брыгадзіра** замест **ПЭДАГОГА.** Роля настаўніка **зьніжаецца** ў навучальнай працы.

Пастанова ЦК партыі аб школе патрабуе, каб вытворчая праца дзяцей была падпарадкавана навучальна-выхаваўчым задачам школы. У пастанове ЦВК, аб вышэйшай школе сказана: «Вытворчая практыка зьяўляецца складанай часткай вучобы студэнта. Таму пры набудове навучальных пляноў і праграм неабходна зьяўляць у адзіны навучальны процэс тэорыю і практыку з такім разьлікам, каб кожная ступень вытворчай практыкі была падпарадкавана праходжаньню адпаведнай часткі тэарытычнага курсу». Пастановы першай сэсіі ДВС БССР кажуць па гэтым пытаньні зусім процілеглае: «Кожны этап вытворчай практыкі, як і ўся вытворчая практыка, павінен быць набудаваны паводле прынцыпу абавязковага вызначэньня для кожнага студэнта сталага працоўнага месца, а г. зн. сталага і сапраўднага ўдзелу ў выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну прадпрыемства» (стар. 21). Вучоны Савет наперакор пастановам ЦК партыі і ЦВК лічыць патрэбным падпарадкаваць вытворчую практыку студэнтаў не навучальным задачам школы, а гаспадарчым інтарэсам прадпрыемства. Тады як пастанова ЦВК устанаўляе для вытворчай практыкі ў ВНУ 30-40 проц. вучэбнага часу адпаведных курсаў, пастановы першай сэсіі ДВС адводзяць для гэтай мэты 10-50 проц. часу, скарачаючы такім чынам мажліваець больш шырокага разгортваньня тэарытычных заняткаў.

Пастановы першай сэсіі ДВС ні ў якім разе ня могуць быць скарыстаны, як кіруючы матар'ял для перабудовы нашай савецкай школы на аснове пастаноў ЦК партыі і ЦВК.

У пэўнай сваёй частцы выданая брашура зьяўляецца нават шкодная і таму не павінна распаўсюджвацца. Зусім незразумела чаму ДВС, выпускаючы гэту брашуру ў лістападзе 1932 г., нават ня даў ніякіх заўваг аб памылковых «левых» апартуністычных установках пастаноў сваёй першай сэсіі. Трэба было-б брашуру зусім не выдаваць, каб не дэзарыентаваць настаўніка ў справе барацьбы за выкананьне дырэктыў партыі па школьнаму будаўніцтву.

П. ПАНКЕВІЧ.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Разьмер паявых узносаў у сыстэме жыльлёвай каапэрацыі БССР

СНК БССР устанавіў для членаў жыльлёва-арэндных каапэрацыйных таварыстваў наступны разьмер дыфэрэнцыяванага паявога ўзносу: пры агульным сямейным бюджэце ў разьмеры да 100 руб. і пры заняцьці на аднаго члена сям'і да 7 кв. м. уносіцца 20 руб: звыш 7 кв. м. — 25 руб. з растэрміноўкай на 24 месяцы; ад 101—150 руб. адпаведна: 28 руб. і 35 руб. на 19 месяцаў; ад 151 да 200 руб. — 36 і 45 руб. па 12 месяцаў; ад 201 да 300 руб. — 45 і 56 руб. на 10 месяцаў; звыш 300 руб. адпаведна 56 руб. і 60 руб. — на 8 месяцаў.

Для членаў жыльлёва-будаўнічых каапэрацыйных таварыстваў устанаўліваецца наступны разьмер дадатковага зваротнага дыфэрэнцыяванага паявога ўзносу на папаўненьне зваротных узносаў саюзу жыльлёвай каапэрацыі: пры агульным сямейным бюджэце ў разьмеры да 100 руб — 20 руб. на 24 месяцы; ад 101 да 150 р. — 30 руб. на 19 м.; ад 151 да 200 руб. — 40 на 12 м.; ад 201 да 300 — 50 р. на 10 м.; звыш 300 руб. — 60 руб. на 8 месяцаў.

Народнаму Камісарыяту Камунальнай Гаспадаркі даручана па працягу дакады выдаць інструкцыю па ажыцьцяўленьні гэтай пастановы.



Пасёлак для рабочых гуты ў Касьцюковічах

Масавы агляд лячэбна-прафіляктычнай дапамогі працоўным

ЦСПСБ, ЦКК-НК РСІ, Наркамат аховы здароўя, ЦК саюзу мэдсанпрацы і рэспубліканская калегія сацыяльнага страхаваньня правялі дзень грамадзкі агляд становішча лечэбна-прафіляктычнай дапамогі застрахаваным у БССР.

Задача агляду вывяліць сапраўднае становішча кожнага віду лекава-прафіляктычнай дапамогі з тым, каб далкам зрыстасаваць ле да бытавых умоў рабочых, работніц, ІТР, настаўнікаў, да непасрэднай работы на вытворчасьці.

У Менску, Віцебску, Гомелі і Барысаве цэнтральная брыгада абсьледуе рад больніц, паліклінік, мэдыцынскіх і страхавых пунктаў, дыэтэталовак на прадпрыемствах, прадпрыемствах, як вядзецца па БССР барацьба з сухотамі і эпідэмічнымі захворваньнямі, як аказваецца работнікам радыльная дапамога, як паставлена лекавая дапамога дзецям застрахаваных і г. д.

Працоўныя павінны прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні грамадзкага агляду. Толькі пры дапамозе і непасрэдным удзеле ў гэтай справе шырокіх мас працоўных можна будзе дабіцца значнага паляпшэньня работы па адным з важных участкаў сацыялістычнага будаўніцтва і перабудовы работы органаў аховы здароўя і сацыялістычнага страхаваньня.

К-ч.

ТЫРАЖ „ІДЭЙ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ ПРАПАНОЎ"

У клюбе харчавікоў імя тав. Сталіна ў Менску адбыўся перны тыраж «ідэй рацыяналізатарскіх прапаноў», якія былі сабраны сярод рабочых і ІТР кушнэрнай фабрыкі імя 1 мая. Усяго паступіла 58 прапаноў, рэалізацыя якіх дасьць каля 50 тысяч руб. эканоміі ў год. У тыражы былі разыграны прэміі на суму 3.000 руб.

Фізкультура

* **Лыжная база** ўсебеларускага стадыёну адкрываецца ў першай палове сьнежня. На базе ёсьць 1.500 пар лыжаў з п'ексамі (лыжны абутак).

* **15 сьнежня** намечана адкрыцьцё на ўсебеларускім стадыёне катка з 400-мэтровай бегавой дарожкай і пляцоўкай для хакею. Каток будзе асьветлен цэлай сыстэмай пражэктароў.

* **1-га сьнежня** ВСФК Беларусі склікае ўсебеларускую нараду па пытаньнях падрыхтоўкі да сусьветнай спартакіяды і зімовай прады. У рабоце нарады прыймуць удзел больш 120 фізкультурнікаў з буйнейшых прадпрыемстваў Беларусі.

Паведамленьні

— ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што ў Віцебску 12-XII-32 г., у 10 гадз. раніцы будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б на разгляд наступных апэляцыйных партсправаў: Пляцілеева Н. М., Буладда М., Перацці К. Р., Мароза Я. С., Гаўрыловіча М. М., Карніцкага І. А., Косікава П. Ф., Красковіча А. Н., Шыла Р. Б., Шыпенка Т. А., Лаазар Ю., Кабака Я. М., Добыша П. С., Буланда Хв., Шыла Ів., Курпыша М., Грынкевіча А. П. Яўка паманё ных таварышоў на ПТ абавязкова. Неабходна прадставіць партпрыцы характарыстыкі ніжэй аб апошняй рабоце.

— 2 сьнежня, у 6 гадз. вечара культпроп Ментаркому ГК КП(б)Б склікае інструкцыйную нараду прапагандыстаў кандыдацкіх школ. Нарада адбудзецца ў таркоме, пакой № 32 або 24. Усім прапагандыстам кандыдацкіх школ яўка абавязкова.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

КІНО ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА | Ад 1 сьнежня

Замешны мастацкі гістарычны фільм з эпохі франц. фэадалізму

ХОД КАНЕМ

(ШУДА ВАЎКОЎ).

Звыш праграмы: кіно-хроніка САЮЗКІНО.

ПАЧАТАК СЭАНСАЎ: у 6, 7.30, 9 і 10.30. | Каса ад 1-га гадз. дня.

Дзеці ў кіно не дапускаюцца.

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ | Ад 1 сьнежня

Мастацкі гістарычны фільм, вытворчасьці Саюзкіно

НОВЫ ВАВІЛЁН

У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ: С. МАГАРЫЛ, Е. КУЗЬМІНА, Д. ГУТМАН, А. АРНОЛЬД.

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: кіно-хроніка Саюзкіно.

Каса адкрыта ад 12 гадз. дня.

СЁНЬНЯ, 1-га сьнежня, у 6 гадз. вечара, у клюбе імя VII зьезду прафэсіяў (б. Саўгандальслужачых, гор Энгельса і Камуністычная вул.)

адкрываецца

ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ

ПА ПЫТАНЬНЯХ:

новых форм аплаты і тэхнімаванньня працы рахункова-статыстычных і іншых груп кіруючага апарату.

НА АДКРЫЦЬЦЁ ЗАПРАШАЮЦЦА ЎСЕ РАХУНКОВА-СТАТЫСТЫЧНЫЯ РАБОТНІКІ гор. МЕНСКУ, а таксама РАБОТНІКІ ТНБ, ЗНАНОЖНІ ПРАЦЫ, ЭКАНАМІСТЫ І ГАСПАДАРНІКІ.

Пасяджэньне фракцыі там-жа ў 5 гадзін вен.

Бел. камітэт „СОЮЗОРГУЧЕТ".

БЕЛЗАГАТКЬЕЦА КУПЛЯЕ ПАЛЫ для ватэр. Зварачацца: Менск, пляц Волі, 7, т. Козічу.

БЕЛКАМУНБАНК

паведамляе ўсіх забудоўшчыкаў па жыльлёвым, камунальным, культурна-бытавым і ведамственым будаўніцтве, якія крэдытуюцца або фінансуюцца праз Белкамунбанк, што яны павінны прадставіць у філіял Белкамунбанку, з якім яны заключалі дагавор, весткі па форме № 5-а і па камунальных па будовах (выдатраўсду, кавязьвы, аўтагужтранспарту і інш.) па форме № 5-б аб становішчы будаўніцтва на 1-XII-г. г. якія не прадставілі гаданьня вестак да паказанага тэрміну, і ня будуць унесены ў сьпіс пераходзячага будаўніцтва на 1933 год, будзе спынена крэдытаваньне.

Забудоўшчыкам,

БЕЛКАМУНБАНК.

Менскі хэміка-тэхналягічны тэхнікум АБВЯШЧАЕ з 20 лістапада па 15 сьнежня 1932 г. НАБОР СТУДЭНТАЎ з адрывам ад вытворчасьці і аддзяленьні па хлебапячэньні:

1. Механічнае—30 чал. (профіль—тэхніка-мэханік).
2) Тэхналягічнае—30 чал. (профіль—тэхнік-тэхналёг).

Умовы прыёму, згодна апошняй пастановы ўраду.

Дзедкі і анкеты ў кандыдаты тэхнікуму (Менск, Падгорны завулак № 7, хэміка-тэхналягічны тэхнікум) ад 10 да 15 гадзін штодзённа.

Да заявы і дакументаў абавязкова прыкладаць паштовых марак на 40 кап.

Пачатак заняткаў 1 студзеня 1933 г.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Памяшканьне Польскага дзярж. тэатру Савецкая, 28 тэл. 15-20

БЕЛАРУСКІ РАБОЧЫ ТЭАТР ЦСПСБ.

Н. Федзін

СЁНЬНЯ

ЧЫНГІЛЬБУД Пьеса ў 3-х актах

Пастаноўка В. Я. Галаўчынера.

Музыка С. Пслонскага. Танцы Е. І. Вуальф

Пачатак роўна ў 8 г. 30 м. Білеты ў касе тэатру з 12-2 і з 4-9 і ў рабочай касе з 12-2 і ад 4-6 гадз.

Па калектыўных заяўках—скідка.

Пралетары | Амэрыканская камэдыя ПАСЬПЕШНАЕ ВЯСЕЛЬЛЕ Звыш праграмы—хроніка. Дзённыя дзіцячыя сэансы ЗА ЧАЦЬВЕРТУЮ ЗЬМЕНУ

СПАРТАК Каса—ад 1-г. дня | Выдатны фільм АРСЭНАЛ Драма ў 7 частках

10-ты ДЗЯРЖЗЬВЯРЫНЕЦ ПРЫБЫЎ НОВЫ ТРАНСПАРТ жывёл і птушэк. Зьвярынец адкрыт з 9 гадз. раніцы да 11 гадз. вечара штодзённа. Па калектыўных заяўках прадстаўляецца 50 проц. скідка. Зварачацца у кантору зьвярынцу загадзя

У аддзел аб'яў званеце па тэлефону 7-81

БЕЛЗАГАТЭКСПАРТ КУПЛЯЕ КАУРЫ ручна-тканыя за наяўны разьлік на выгодных умовах З прапановай зварачацца: г. Менск, Сураская вул. № 10 (дом таможні) Белзагатэкспарт. Па ўказаньні адрасу будзе высланы спэцыяліст для ацэнкі

Аршанская аўтамабільная школа ФЗФ „САЮЗТРАНС" абвяшчае ПРЫЁМ аўдыторнай і заочнай на аддзяленьне шофераў, мэханікаў у ліку 45 асоб з палутарагадовым тэрмінам навучаньня. Прымаюцца асобы ва ўзросьце 16-18 год. з адукацыяй за сямігодку. Прыём заяў да 15-XII г. г. Да заявы трэба дадаць дакументы: аб адукацыі, сац. становішчы, стане здароўя, засьведчаную анкету і паштовых марак на 30 кап. Адрас школы: г. Ворша, Аўта-школа. Стыпэндыяй ад 29 да 45 рублёў і інтэрнатам вучні забясьпечваюцца. Адміністрацыя школы.

Менск, друкарня «Зьвязды».

ІНСТЫТУТ МАСАВАГА ЗАВОЧНАГА НАВУЧАНЬНЯ ПАРТАКТЫВУ пры ЦК КП(б)Б

РАСКЛАД

РАДЫЁ-ПЕРАДАЧ на СЬНЕЖАНЬ МЕСЯЦ 1932 г.

Лекцыі перадаюцца штодзённа (акрамя 6, 12, 13, 24 і 31) ўвечары ад 19-й да 22-й гадзіны і пэўтаранна назаўтра раніцою ад 8-й да 9-й гадз. праз Менскую радыё станцыю РВ—10, хвалі 1195 мэтраў.

(Аб зьменах у раскладзе ніжны раз папярэдня паведамляцца).

Рашэньні партыйных намітэтаў павінны прынесьці усе меры да забясьпечэньня неабходных умоў для прадукцыйнай работы завочнікаў, у прыватнасьці пакідастаўленьня завочнікам ДАДАТКОВЫХ ТРОХ СВАБОДНЫХ ДЗЁН у месяц і прадастаўленьня часу для наведваньня радыё-аўдыторый і курсаў-кансультацый.

Абавязкова рашэньні партыкамітэты прымацоўваць да кожнай радыё-аўдыторыі прапагандыста-кансультанта, абавязкі якога: прапрацоўка і растлумачэньне завочнікам перадаваемых лекцый, а таксама сыстэматычны вучот і кантроль за акуратным наведваньнем радыё-лекцый.

(З пастановы ЦК УсеКП(б) ад 7-8 1932 г.).

I. Завочны камуністычны унівэрсытэт

6-XII Кансультацыя т. Лойкапа фізычнай і палітычнай карце сьвету.

11-XII ПАЛІТЭКАНОМІЯ—„Гандлёвы і пазычковы капітал".

17-XII ГІСТ. РЭВ. РУХУ—„Ленін і бальшавікі у 2 Інтэрнацыяле".

23-XII ПАЛІТЭКАНОМІЯ—„Зямельная рэнта".

28-XII Лекцыя па прыродазнаўстве.

II. Завочная саўпартшкола

ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ ЗСПШ

2-XII ПАЛІТЭКАНОМІЯ—„Тэорыя прыбытку і цэны вытворчасьці".

6-XII ГІСТ. РЭВ. РУХУ—„Вайна і крах 2-га Інтэрнацыялу".

20-XII Лекцыя па прыродазнаўстве.

ДЛЯ ЯЎРЭЙСКАЙ ЗСПШ (на яўрэйскай мове)

14-XII Кансультацыя па яўрэйскай мове.

26-XII ГІСТ. РЭВ. РУХУ—„Разлажэньне фэадалізму і ўзьнікненьне капіталізму".

III. Цыкляваныя радыё-лекцыі для ўсіх форм завочнай партвучобы

1. „Барацьба партыі на два фронты на асноўных этапах гісторыі".

У сьнежні перадаюцца апошнія тры лекцыі гэтага цыклю — 3, 21 і 31 чысла.

2. СССР на шляхах вызваленьня ад тэхнічна-эканамічнай залежнасьці ад капіталістычных краін.

13-XII „Як зьмяняецца геаграфія СССР".

25-XII „СССР—краіна самога буйнога ў сьвеце земляробства".

7-XII „Задачы пралетарскай літаратуры і мастацтва ў барацьбе за бясклясавае грамадзтва".

4. Перадачы для настаўніцтва

28-XII „Чарговыя задачы дзіцячага камуністычнага руху"

IV. Эпізодычныя радыё-лекцыі для ўсіх форм завочнай партвучобы

1-XII „Задачы канчатковага разьмеркаваньня ўраджаю і прыбытку у калгасах".

4-XII „За разгортваньне савецкага і калгаснага гандлю".

9-XII „Задачы павышэньня ўраджайнасьці ў БССР".

16-XII „Вынікі верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б".

19-XII Аб міжнародным становішчы.

17-XII „Вайна—як сацыяльная зьява" (для кампалітскладу РСЧА).

V. Інструкцыйныя перадачы для работнікаў сыстэмы завочнай партасьветы (кансультантаў, рэцэзантаў, райарганізатараў, прапагандыстаў і г. д.).

Інструкцыйныя перадачы перадзюцца: 10 і 22 чысла.

VI. Інфармацыйная перадача ІМЗО пры ЦК КП(б)Б аб становішчы завочнай партвучобы — 15 сьнежня.

Да ўвагі завочнікаў і радыё-слухачоў

Перадачу лекцый, паказаных у гэтым раскладзе, слухайце ў спэцыяльна-абсталяваных радыё-аўдыторыях, якія знаходзяцца ў партгабінетах на тэрыторыі саўгасаў, калгасаў, буйных прадпрыемстваў і г. д. У гэтых аўдыторыях таварышы павінны атрымаць кансультацыю прапагандыстаў па пытаньнях праслуханых лекцый і ўсе спраўці аб завочнай партвучобе.

Нам, дырэктара ІМЗО пры ЦК КП(б)Б ш. эпштэйн.

Тав. ЗАВОЧНІКІ! Гэты расклад выраж і рэгулярна слухай прызначаныя для цябе лекцыі.

Галоўлітбел № 337.